Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 верасня 2024 г.
СЕРАДА
№ 182 (30316)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«АДЗІНСТВА ДЛЯ НАС — ГАЛОЎНАЯ ЎМОВА РАЗВІЦЦЯ НАЦЫІ»

Галоўная падзея Дня народнага адзінства — патрыятычны форум «Калі мы адзіныя» — аб'яднала ўсю краіну. У «Мінск-арэне» сабраліся тысячы прадстаўнікоў самых розных сфер з усіх куточкаў нашай краіны — сапраўднае ўвасабленне народнага адзінства. Гэтай тэмай быў прасякнуты ўвесь форум. Яркае высокатэхналагічнае шоу паказала гістарычныя і сучасныя адметнасці беларускіх рэгіёнаў, кожны з якіх захоўвае і памнажае галоўныя каштоўнасці беларускага народа. Па традыцыі ўдзел у гэтым форуме ўзяў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Фота БелТА.

«Сёння Беларусь адзначае Дзень народнага адзінства — свята, якое сімвалізуе непарыўную сувязь пакаленняў, сілу духу беларускага народа і яго нястомнае імкненне жыць у сваёй дзяржаве на роднай зямлі. Ён асабліва значны для кожнага, хто не толькі па нараджэнні, але душой і сэрцам адчувае сябе беларусам», — адкрыў форум кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што 85 гадоў таму адбылася лёсавызначальная падзея. І гордае «мы — беларусы» загучала на ўвесь свет з самага цэнтра Еўропы. Гэта быў голас людзей, якія сталі адзіным народам. Цяпер назаўжды!

«Доўгі час сціплая мясціна беларусаў на скрыжаванні цывілізацый раз-пораз станавілася палігонам для чужых войнаў і месцам разборак моцных свету гэтага. Нашы дамы спальвалі, маёмасць рабавалі. Землі дзялілі па княствах, ваяводствах і губернях, людзей — па мове, веры і ідэалагічных перакананнях, — сказаў Прэзідэнт. — Нашы продкі неаднойчы глядзелі ў вочы смерці, але кожны раз няскоранымі ўставалі з каленяў, выціраючы пот і слёзы, ішлі наперад».

«НАШЫ МОВА, ВЕРА І ДУХОЎНАЕ АДЗІНСТВА НЕ ДАЛІ ЗАБЫЦЦА, ХТО МЫ ЁСЦЬ»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што дарога да набыцця ўласнай дзяржаўнасці перад беларусамі адкрылася ў пачатку мінулага стагоддзя. Скончыліся ранейшыя міжнацыянальныя спрэчкі, адмовіліся ад тэрытарыяльных прэтэнзій і 1 студзеня 1919 года стварылі беларускую нацыянальную дзяржаву. «Нам прадставіўся гістарычны шанц пабудаваць свой дом, жыць, працаваць і гадаваць дзяцей у міры і згодзе, стаць паўнапраўнымі гаспадарамі ўласнага лёсу, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але найцяжэйшыя наступствы Першай сусветнай вайны, Грамадзянская вайна, якая набірала абароты, інтэрвенцыя кааліцыі заходніх краін не дазволілі тады спраўдзіцца марам нашых суайчыннікаў аб мірным і шчаслівым жыцці». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што тады голас толькі што створанай савецкай рэспублікі на гэтым фоне быў ледзь чутны. «Магчыма, і таму, што ўсярэдзіне яе не было адзінства. Затое былі тыя, хто думаў толькі аб асабістай выгадзе і сваіх, а не народных інтарэсах. Нацмены ўсіх масцяў наперабой прызначалі сябе «ўладамі». І кожны, хто рваўся кіраваць новай дзяржавай, прыкрываўся імем беларускага народа, а народ, збяднелы і галодны, малапісьменны і абуты ў лапці, змораны вайной і разрухай, думаў, як выжыць, як выратавацца, — правёў кароткі гістарычны экскурс беларускі лідар. — Магчыма, калі б на світанні мінулага стагоддзя мы мелі моцную ўладу і згоду, то выстаялі б. І не было б тады трагедыі Рыжскага дагавора, паводле якога 4,5 мільёна сыноў і дачок Беларусі раптоўна сталі адно аднаму чужымі на роднай зямлі».

СТАР. 2

КАРОТКА

- **ВУП Беларусі ў студзені — жніўні вырас на 4,9 працэнта.**
- Анлайн-віктарыну «Сіла ў адзінстве» запускае БРСМ.
- **Пасол Кітая ўручыў копіі даверчых грамат кіраўніку беларускага МЗС.**
- Каля 30 працэнтаў прадукцыі ў будаўнічай галіне Беларусі інавацыйная.
- **Мінтранс абнавіў тарыфы на праезд па платных дарогах Беларусі.**
- У Беларусі з'явіцца інтэрактыўная карта музеяў установаў адукацыі.
- **Ваенныя краін СНД на пасяджэнні ў Беларусі абмяркуюць пытанні супрацьпаветранай абароны.**

ISSN 1990 — 763X

Законы павінны быць справядлівымі і прымацца ў імя людзей

З выступлення Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі КАЧАНАВАЙ на адкрыцці другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання

Сімвалічна, што пачатак другой сесіі Савета Рэспублікі супаў з важным дзяржаўным святам у нашай краіне — Днём народнага адзінства.

Шматвяковая слаўная гісторыя беларускай дзяржаўнасці не раз пацвярджала: сіла народа — у адзінстве. Менавіта дзякуючы згуртаванасці, непахіснасці духу і самаахвярнай любові да роднай зямлі, нягледзячы на ўсе выпрабаванні і цяжкасці, пад мудрым кіраўніцтвам нашага Прэзідэнта, шаноўнага Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, за параўнальна невялікі перыяд часу беларусы здолелі стварыць сваю ўласную дзяржаву — моцную, суверэнную і незалежную Рэспубліку Беларусь.

Цяперашні перыяд для нас азнаменаваны шэрагам найважнейшых падзей у лёсе беларускага народа і нашай краіны. Упершыню правядзены адзіны дзень галасавання, падчас якога абраны дэпутаты ўсіх узроўняў.

СТАР. 4

У парламенцкім партфелі нязначных пытанняў няма

З выступлення Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігара СЕРГЯЕНКІ на адкрыцці другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання

Сёння, у Дзень народнага адзінства, мы адкрываем другую сесію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання. Гэта і сімвалічна, і адказна. Бо менавіта мы з вамі — голас народа, прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны. Менавіта мы павінны ўдзельнічаць у далейшай кансалідацыі грамадства, забяспечыць якаснае развіццё заканадаўства ў яго інтарэсах.

Дзень народнага адзінства вучыць нас быць уважлівымі да сваёй гісторыі, знаходзіць у мінулым адказы на актуальныя пытанні сучаснасці і сумесна ствараць сваю будучыню.

Мы не дазволім ізноў падзяліць нас, сцерці гістарычную памяць, зрабіць Беларусь і беларусаў заложнікамі чужых нам геапалітычных інтарэсаў. Мы захаваем свой суверэнітэт, права самастойна вызначаць унутраную і знешнюю палітыку, выбіраць сяброў і саюзнікаў. Менавіта гэтым і будзем кіравацца ў рэалізацыі сваіх дэпутацкіх паўнамоцтваў.

СТАР. 4

«АДЗІНСТВА ДЛЯ НАС — ГАЛОЎНАЯ ЎМОВА РАЗВІЦЦЯ НАЦЫІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ўсе гарантыі нацыянальна-культурнага жыцця ў складзе польскай дзяржавы засталіся толькі на паперы. У Заходняй Беларусі не было нават самай адносна малой аўтаноміі. Беларуская культура існавала ва ўмовах пастаяннай барацьбы за выжыванне. Пачалі знікаць нацыянальныя школы, тэатры, газеты. «Знішчалася нацыя. Ахвярамі бесчалавечных рэпрэсій і паліцэйскага тэрору сталі больш за 3 тысячы зняволеных па палітычных матывах. Катаванням і зняволенню ў канцлагерах і турмах падвяргаліся тыя, хто не жадаў апалячвацца, размаўляў, пісаўся і спяваў калыханкі дзецям на роднай матчынай мове», — нагадаў трагічныя факты нашай гісторыі Прэзідэнт. 17 верасня 1939 года панскія кайданы ўпалі пад націскам гістарычнай справядлівасці. «Вызваленчы паход Чырвонай Арміі дазволіў уз'яднацца і сем'ям, і гвалтоўна адабраным тэрыторыям, — нагадаў слаўны факт нашай гісторыі Аляксандр Лукашэнка. — Але і беларусы ўвесь гэты час не сядзелі склаўшы рукі, пакорліва чакаючы, калі іх прыйдуць вызваляць. Нашы продкі трымаліся за свае карані і зямлю, перадаючы з пакалення ў пакаленне памяць і гісторыю свайго старажытнага роду. Нашы мова, вера і духоўнае адзінства не далі забыцца, хто мы ёсць насамрэч. Гэта і зрабіла іх мацнейшымі. І нішто не магло спыніць беларусаў. Ні пагрозы паноў, ні палітычныя граніцы».

БЕЛАРУСКУЮ МІРАЛЮБНАСЦЬ НЕ ТРЭБА ПРЫМАЦЬ ЗА СЛАБАСЦЬ

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што, загартаваныя ў нацыянальна-вызваленчым руху 1921—1939 гадоў, нашы гераічныя продкі сталі непераадольным шчытом беларускага супраціўлення на шляху фашысцкай навалы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднавілі краіну з попелу ў пасляваенныя гады, пераадолелі хаос 90-х. «І пабудавалі суверэнную і незалежную дзяржаву. Упершыню ў сваёй гісторыі. Не толькі пабудавалі. Але і захавалі яе. І гэта зрабілі мы з вамі, у тым ліку і тыя, хто сядзіць у гэтай вялікай зале», — канстатаваў Прэзідэнт.

Па яго словах, праз суровыя выпрабаванні часу і сур'ёзныя страты, прымнажаючы нацыянальныя багацці на вопыце ранейшых пакаленняў, Беларусь усе 85 гадоў упэўнена рухаецца наперад дарогай міру і стваральнай працы.

«Нават цяпер, калі з тэрыторый заходніх і паўднёвых суседзяў на нас нацэлены натаўскія гарматы, уздоўж рубяжоў памнажаюцца кіламетры агароджы і мінных палёў, мы адказваем проста і ў найлепшых традыцыях «апошняй дыктатуры Еўропы» — адкрываем граніцы і не патрабуем віз. І людзі на тым баку нас чуюць. Едуць, глядзяць і робяць высновы зусім не на карысць тых, хто забараняе ім сюды прыязджаць», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз канстатаваў, што Беларусь была і застаецца прыхільніцай міру. Нашы маштабныя мірныя ініцыятывы гучаць з трыбуны ААН, на пляцоўках міжнародных форумаў. Мы прапаноўваем да абмеркавання Еўразійскую хартыю разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі. «Гэтая шматпалярнасць ведаце, каму не патрэбная. Але гэтага ўжо не пазбегнуць. Гэтая шматпалярнасць не проста стукаецца ў дзверы, яна ўжо прыйшла да нас, — заўважыў беларускі лідар. — Мы абавязкова знойдзем выхад з глабальнага крызісу бяспекі, бо з намі — найбліжэйшыя саюзнікі з многіх краін планеты. Ізаляваць Беларусь не атрымаецца. Нас усё часцей чуюць і падтрымліваюць у свеце».

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што неўзабаве і ў заходніх эліт наступіць разуменне, што адзіны шлях — дамаўляцца. «Гэтага хочуць нашы народы. Мы, беларусы, — народ мірны і працавіты. Мы не хочам вайны. Верым: настане дзень, калі ў суседніх дзяржавах запануе мір і кроўныя браты, блізкія і далёкія сябры будуць жыць у згодзе і сяброўстве. Беларусь гатова ўнесці свой уклад у пабудову гэтага свету. І робіць для гэтага ўсё. Але я ўжо казаў: беларускую міралюбнасць не трэба прымаць за слабасць», — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што гэтыя размовы — не блеф і згушчванне фарбаў. «Як ніколі раней, нам ёсць чым адказаць. Таму ў гэтым плане будзьце спакойныя. Спакойна рабіце сваю справу, гадуйце дзяцей», — адзначыў ён.

«НАМ ТРЭБА НЕ САРОМЕЦЦА БЫЦЬ БЕЛАРУСАМІ»

«Мы свята шануем памяць аб усіх, хто самаддана адстойваў права беларусаў «людзьмі звацца» і заплаціў за гэта цаной свайго жыцця і маладосці. І нікому не дазволім паквапіцца на святую зямлю продкаў, на незалежнасць і суверэнітэт Радзімы. Мы паслядоўна будзем адстойваць нашы спрадвечныя каштоўнасці і праўду, як гэта рабілі бацькі, дзяды і прадзеды. А калі хтосьці з вас, можа, за межамі гэтай залы сумняваецца ў тым, што мы не аддадзім на абразу Беларусь, мы вас будзем пераконваць, моцна пераконваць, каб вы зразумелі, што іншай зямлі ў вас няма і не будзе ніколі», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што 85 гадоў таму менавіта з вызваленчага паходу Чырвонай Арміі пачалося адраджэнне страчанай унутранай цэласнасці Айчыны. «З таго часу беларускі народ перажыў нямала выпрабаванняў, ствараючы ўнікальную прастору для мары і для жыцця на скрыжаванні цывілізацый і пракладаючы дарогу да шчасця ў бесперапыннай барацьбе за волю, лепшую долю і родны парог», — сказаў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, кожны з этапаў гэтага нялёгкага шляху беларусы годна пераадольвалі, абапіраючыся на любоў да міру і праўды, справядлівасць і патрыятызм, узаемную павагу і добрасуседства. «Заўважце: мы абапіраліся не на захопніцтва, не на жорсткасць, не на перавагу ў адносінах да іншых краін і народаў, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мы адзіныя ў імкненні жыць на роднай зямлі сваім розумам і працай. Адзінства для нас — галоўная ўмова развіцця нацыі. Таму нас не адолелі ні карычневая чума, ні ліхія 90-я, ні пандэміі, ні спробы каляровых мяцяжоў, ні рабаўнічыя санкцыі і ваенныя пагрозы». Па словах беларускага лідара, Дзень народнага адзінства нагадвае нам аб тым, што ніякія межы, ніякія выпрабаванні не змогуць зламаць дух народа, калі ў сэрцы ў кожнага з нас будзе наша Беларусь.

Прэзідэнт агучыў і галоўныя для ўсіх беларусаў словы: «Нам трэба не саромецца быць беларусамі і перастаць увесь час азірацца то ўглыб стагоддзяў, то па баках. У нас ёсць тое, што нас аб'ядноўвае і робіць шчаслівымі на роднай зямлі. Гэта слаўная спадчына продкаў і не менш яркія дасягненні сучаснікаў». Ён звярнуў увагу, што, сфарміраваная талентам і працай мноства выдатных сыноў і дачок беларускай зямлі, наша ўнікальная культура даўно стала неад'емнай часткай агульнай спадчыны ўсяго чалавецтва. «На жаль, сёння мы ўсё часцей назіраем спробы забараніць або выключыць яе з парадку дня разам з сімваламі Радзімы, тысячагадовай гісторыяй і ўсім тым, чым мы ганарымся, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Магчыма, прычыны такога стаўлення ў тым, што мы верныя традыцыям продкаў і духоўна адрозніваемся ад Захаду. Там даўно адвыклі атаясамляць чалавечую культуру з лёсамі ўсяго чалавецтва. Гэта прывяло да гвалтоўнага навязвання заходніх каштоўнасцяў астатнім нацыям і знішчэння культурнай разнастайнасці планеты».

«ГЭТА БУДЗЕ МАРАФОН ТРЫАДЗІНСТВА»

Прэзідэнт запэўніў, што насуперак сілам, якія імкнуцца пасеяць супярэчнасці і нянавісць у нашым грамадстве, мы павінны праявіць згоду і агульнасць духоўных традыцый і гістарычнага лёсу народа. Таму, па яго словах, сімвалічна, што ў святочны дзень дадзены старт усебеларускай акцыі «Марафон адзінства». «Гэта будзе марафон трыадзінства традыцый: нацыянальнай культуры, якую беражліва захоўваем і развіваем, талентаў нашых людзей, якімі славіцца беларуская зямля, прыгажосці славянскай душы, якая напаўняе свет вакол гармоніяй і ўзаемаразуменнем. Няхай кожны адчуе ўсю палітру талентаў беларускай зямлі і дакранецца да багатай спадчыны нацыянальнай культуры. Няхай яркія фарбы і мелодыі творчасці ва ўсіх кутках краіны абудзяць у сэрцах беларусаў любоў да Радзімы. У гэтым залог годнай будучыні нашага народа і святы абавязак сучаснікаў, на якім павінна будавацца жыццё ў адзінай сям'і патрыётаў і працаўнікоў, імя якой — Рэспубліка Беларусь», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў усіх беларусаў разам любіць, сябраваць, марыць, працаваць і адпачываць па-беларуску! «Давайце берагчы і абараняць Беларусь! Гэта завяшчалі нам продкі, пра гэта мы гаворым нашчадкам. Гаворым, таму што час выбраў нас!» — сказаў ён.

«НАПАД НА БЕЛАРУСЬ — ГЭТА ТРЭЦЯЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА»

Прэзідэнт звярнуў увагу, што нават у святочныя дні рабочы настрой не пакідае. Ён нагадаў, як падчас урачыстага сходу, прымеркаванага да Дня Незалежнасці, прыходзілася звяртацца да рабочых пытанняў. Але і цяпер некаторыя стаяць вельмі востра, таму, па словах Аляксандра Лукашэнкі, лепей пачуць іх з першых вуснаў.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што збеглыя і іх куратары, каб ізноў узбаламуціць наша грамадства, стварыць сітуацыю перадмяцежнага характару напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, пачынаюць распрацоўваюць план дзеянняў. «Усё было, і атака ў сродках масавай інфармацыі. Мы спрабуем дастойна на гэта адказаць. Сведчаннем таму з'яўлецца пачатак работы нашага канала «Першы інфармацыйны». Гэта дастойны адказ», — заўважыў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што не скідваюць яны з рахункаў і ўзброенае нападзенне на Беларусь. «Мы разумеем, як гэта бывае: напярэдзе ідуць ашалелыя з шэрагаў нашых, а следам — не нашы. Мы гэта бачылі ў 2020 годзе. Праўда, не бачылі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што і сёння за мяжой ствараюць харугвы, цэлыя палкі тых, хто марыць сюды прыйсці са зброяй у руках.

Прэзідэнт адзначыў, што ён не нагнятае абстаноўку. І ў пацвярджэнне сваіх слоў працытаваў адзін дакумент: «Па даных нашых спецслужбаў, падчас закрытай часткі перамоваў нашых збеглых у адной з краін (не называю па пэўных прычынах) прадстаўнікі ЗША агучылі наступныя тэзісы: з сярэдзіны верасня да пачатку ліставада ЗША чакаюць істотную эскалацыю ваеннай абстаноўкі як з боку Масквы, так і з боку Кіева. На фронце. Я хачу, каб гэта пачулі і расіяне. Мы пакуль не даводзілі да іх гэту інфармацыю. Заходнія спецслужбы гавораць пра Беларусь як пра магчымае месца эскалацыі. Нібыта зацішша. Так, у Курск зайшлі (украінскія вайскоўцы. — **«Зв.»**), сыходзяць — сыдуць, украінцы там не ўтрымаюцца. Але гэта не трэба амерыканцам. Трэба, каб вайна працягвалася да апошняга ўкраінца, а яшчэ лепш — рускага. Ім патрэбна вайна. І гэта зацішша, якое наступіла на фронце, ім не трэба. Ім патрэбна эскалацыя. Таму гавораць пра Беларусь як пра магчымае месца эскалацыі сітуацыі».

Пры гэтым, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, размова ідзе не аб уступленні ў баявыя дзеянні Узброеных Сіл Беларусі. «Мы гэта ніколі не зробім, калі чужы бот не ступіць на нашу зямлю», — запэўніў ён. Галоўная тэма гэтых размоў — рэакцыя Кіева на пралёты расійскіх беспілотнікаў праз тэрыторыю Беларусі, аж да атак на прыгранічную інфраструктуру. «Гэта значыць, амерыканцы ўказалі Кіеву, калі складуцца абставіны, атакаваць нашу інфраструктуру па паўднёвай мяжы. Прычына — расійскія беспілотнікі лётаюць над тэрыторыяй, побач з тэрыторыяй Беларусі», — растлумачыў становішча спраў кіраўнік дзяржавы.

«Павінен вам адкрыта заявіць: мы дамовіліся па каналах з украінцамі, што не будзем у СМІ падсвятляць факты залёту беспілотнікаў, і расійскіх, і ўкраінскіх, на нашу тэрыторыю, — расказаў Прэзідэнт. — Чаму гэта адбываецца? Таму што і тыя, і другія дрэнна кіруюць гэтымі беспілотнікамі. Па-першае, новыя для іх. Па-другое, працуюць сістэмы радыёэлектроннай барацьбы, якія збіваюць з курсу беспілотнікі. І адзін з іх мы знайшлі аж пад Бабруйскам, у цэнтры Беларусі. І гэта былі ўкраінскія беспілотнікі, не расійскія. Хоць і з іншага боку бывае. Мы дамовіліся».

Тым не менш, па словах Аляксандра Лукашэнкі, ляклававоды з Вашынгтона штурхаюць Украіну да супрацьстаяння з Беларуссю. «І я хачу спытаць у амерыканцаў: вы міру хочаце, мірных перагавораў ці эскалацыі сітуацыі? Я нездарма гэта пытаю. Таму што яны апошнім часам вельмі часта намякалі нам аб перагаворах. І нават вылучылі ўмовы для гэтых перагавораў. Мы пагадзіліся. А як тады гэта размець?» — паставіў пытанне беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што ў гэтым сутнасць заходняй палітыкі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што і ў пачатку мінулага стагоддзя так было. «Прыкладна праз 100 гадоў усё гэта паўтараецца. Мы гэта ўсё праходзілі. Таму што жывём у эпіцэнтры на скрыжаванні ўсіх шляхоў», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што наша краіна — гэта геаграфічны цэнтр Еўропы. І шматлікія войны праходзілі праз гэтыя землі, прыносячы Беларусі гора і разбурэнне. «Гісторыя паўтараецца. Але я хачу проста ў сувязі з гэтым папярэдзіць нашых праціўнікаў. І тых, хто не разумее яшчэ. Не трэба гэта рабіць! Гэта не пойдзе на карысць не толькі рэгіёну Еўропы, але і ўсёй планеце. Напад на Беларусь , запомніце, — гэта трэцяя сусветная вайна. Таму ні ў якім разе ні ўкраінцам, ні расіянам, яны гэта выдатна разумеюць, ні амерыканцам, якія хочуць адсядзецца за акіянам, гэтага рабіць нельга», — заявіў Прэзідэнт.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, не супакойваюцца і збеглыя. «Ім не церпіцца вывесці з арэны палітычных дзеянняў Прэзідэнта Беларусі. Дамовіліся аб тым, што Літва, як гэта было напярэдадні або ў першыя дні спецыяльнай ваеннай аперацыі Расіі ва Украіне, ініцыіруе ў міжнародным крымінальным судзе ў Гаазе разгляд беларускага пытання. Мэта — прыцягнуць Прэзідэнта Беларусі да адказнасці і выключыць яго з парадку дня. Як яны пішуць, каб Прэзідэнт Беларусі, калі пачнуцца мірныя перагаворы ва Украіне, не змог браць удзел у гэтых перагаворах. Яны ведаюць, што мы патрабуем, каб пры заключэнні мірнага дагавора ва Украіне былі выкананы інтарэсы Беларусі. Там яны не бачаць нашага прадстаўніцтва», — расказаў Прэзідэнт. І адказаў усім: «Я хачу, каб яны пачулі сёння, з гэтай высокай трыбуны: мы ведаем пра ўсе задумы. І нічога ў іх не атрымаецца. Яны не змогуць яшчэ раз паўтарыць тое, што было ў 2020 годзе. Мы — людзі, якія ўмеюць засвойваць урокі з мінулага».

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што расказаў гэта на такім вялікім форуме, каб яго і беларусаў пачулі. Ён заўважыў, што звычайна ў такіх выпадках чуюць своечасова. «Пытанні сур'ёзныя, але гэта не азначае, што за межамі гэтай залы вы павінны напружвацца і перажываць. Мы зробім усё, каб на гэтай зямлі больш не было вайны», — запэўніў ён. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што старэйшае пакаленне беларусаў настроена перадаць малодшаму пакаленню годную зямлю, дзе можна жыць і гадаваць дзяцей. «Ніякія беспілотнікі, ніякія ракеты далёкага дзеяння ім не дапамогуць. Я вам клянуся, што ў нас ёсць чым адказаць. У нас ёсць што зрабіць так, каб яны задумаліся, перш чым рухацца ў нашым напрамку», — паабяцаў Прэзідэнт.

Валерыя СЦЯЦКО.

«ГЭТА І ЁСЦЬ НАРОДНАЕ АДЗІНСТВА — КАЛІ КОЖНЫ СКАНЦЭНТРАВАНЫ НА СВАІХ ЗАДАЧАХ І МЭТАХ»

Па добрай беларускай традыцыі, важная частка дзяржаўных свят — уручэнне ўзнагарод людзям, якія сваёй штодзённай працай робяць краіну лепшай, забяспечваюць яе дабрабыт і ствараюць імідж Беларусі на міжнароднай арэне. Дзень народнага адзінства — самае маладое дзяржаўнае свята, але з традыцыямі. Таму ранкам у Палацы Незалежнасці Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па традыцыі ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды.

«Сёння ў нас у краіне вялікае свята: мы адзначаем Дзень народнага адзінства — свята, якое азначае трыумф гістарычнай справядлівасці. 85 гадоў таму вызваленчы паход Чырвонай Арміі паставіў кропку ў пытанні нашага дзяржаўнага самавызначэння. Народ, доўгія гады падзелены на заходніх і ўсходніх беларусаў, стаў адзінай нацыяй. Пачалася гісторыя вялікага шляху: у гады Вялікай Айчыннай — драматычнага і гераічнага, пасля Вялікай Перамогі — мірнага і стваральнага шляху», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, у Палацы Незалежнасці сабраліся сапраўдныя прадаўжальнікі традыцый тых, хто не спасаваў перад цяжкасцямі стагоддзя мінулага, хто ствараў, абараняў і ўзнімаў нашу краіну.

Сярод узнагароджаных — работнікі сфер адукацыі і аховы здароўя. «Вы заўсёды побач з людзьмі і часам ведаеце аб праблемах кожнага з нас лепш за родных і блізкіх. Вы — аснова беларускага грамадства», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што беларусы ганарацца нашымі навукоўцамі і вытворцамі, якія ўвасобілі мару беларусаў аб народным аўтамабілі.

«Сёння мы дзякуем за талент і майстэрства дзеячам культуры. Вы ўзбагачаеце нацыянальную спадчыну, ствараеце будучыню, пакідаючы ў мастацтве яркі след, — сказаў Прэзідэнт. — Дзякуй трэнерам, якія ўзгадавалі нашых новых алімпійскіх медалістаў. Летняя Алімпіяда стала яшчэ адной значнай старонкай у гісторыі айчыннага спорту. Нас спрабавалі адхіліць, пазбавіць сцяга і гімна. Але свет усё роўна гаварыў пра беларусаў, захапляючыся іх перамогамі разам з намі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што свет ізноў гаворыць пра беларусаў дзякуючы бліскучым выступленням зборнай Беларусі на чэмпіянаце свету па пажарным спорце. Дзевяць медалёў: пяць залатых, два сярэбраныя і два бронзавыя. Сусветны рэкорд. Кожны поспех, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, на славу роднай краіны. «Гэта сапраўдны падарунак да сённяшняга свята і вынік вашай тытанічнай працы!» — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што нам сапраўды па сілах любыя цяжкасці. «Мы пераканаліся ў гэтым, прыняўшы ўдар прыроднай стыхіі. Сёння мы ўшаноўваем ратавальнікаў і энергетыкаў, камунальнікаў і леснікоў, якія працавалі, не зважаючы на асабісты час і абставіны, і ў найкарацейшыя тэрміны вярнулі жыццё людзей у нармальнае рэчышча, — адзначыў ён. — І, вядома, за магчымасць планаваць будучыню, ісці да мар і ўвасабляць задуманае мы дзякуем людзям у пагонах, якія стаяць на варце парадку і закона, берагуць наша чыстае неба. Гэта і ёсць народнае адзінства — калі кожны сканцэнтраваны на сваіх задачах і мэтах, а агульны вынік робіць Беларусь прыгожай, утульнай, шчаслівай, мірнай».

Прэзідэнт павіншаваў герояў дня з высокімі ўзнагародамі і ганаровымі званнямі. Ён адзначыў, што сваімі дасягненнямі яны зрабілі гэты святочны дзень у Палацы Незалежнасці асаблівым. «Дзякуй за працу! Дзякуй усім, хто на шляху да поспеху стаў для вас надзейнай апорай, — родным, блізкім, сябрам, калегам, саслужыўцам. Асабістая ўзнагарода — гэта заўсёды вынік каманднай работы. Гэтаксама за кожным дасягненнем краіны, гістарычным і сучасным, заўсёды стаяў і будзе стаяць увесь наш народ, — падсумаваў беларускі лідар.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

УЗНАГАРОДА З РУК ПРЭЗІДЭНТА — НАЙЛЕПШАЕ ПРЫЗНАННЕ

Узнагароды з рук Прэзідэнта атрымалі людзі, якія насуперак усяму даказалі, што Беларусь — моцная краіна, што беларусы здольны супрацьстаяць шматлікім выклікам. Кіраўнік дзяржавы ўзнагародзіў герояў летніх Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульняў у Парыжы — медалістаў і іх трэнераў.

Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў па акадэмічным веславанні Яўген ЗАЛАТЫ прызнаўся журналістам, што ехаў у Палац Незалежнасці з баявым настроем, але хваляваўся: упершыню ў жыцці прыйшлося выступаць з адказным словам перад такой публікай. «Пасля Алімпійскіх гульняў ужо прайшоў час, жарсці ўлягліся, на мерапрыемствы запрашаюць — да гэтага пакуль прывыкаю, але ўспрымаю гэта як вялікі гонар. У Палацы Незалежнасці я ўпершыню, уражанні незабыўныя», — падзяліўся ён. Яўген Залаты ўзнагароджаны ордэнам Пашаны. «Я думаю, што дзяржаўную ўзнагароду можна параўнаць, нават калі яна не вышэйшая, з алімпійскім медалём. Гэта азначае, што я зрабіў нешта важнае для дзяржавы і ў гэты складаны час мой сярэбраны медаль вельмі важны для Беларусі. Канешне, я вельмі ганаруся і я разумею, што вынік нашай каманды сапраўды вельмі значны, калі яго так высока ацанілі», — адзначыў Яўген Залаты.

Сапраўдны герой Паралімпійскіх гульняў Ігар БОКІЙ, які ў Парыжы стаў 21-разовым паралімпійскім чэмпіёнам па плаванні, атрымліваць узнагароды ўжо прывык. Але ордэн Айчыны II ступені — узнагарода асаблівая. «Я вельмі рады, што дзяржава так высока цэніць нашы дасягненні. Канешне, гэта прыемна. І хочацца павіншаваць усіх з такім прыгожым і важным святам, як Дзень народнага адзінства. Матывацыя ў мяне нязменная: мне хочацца праверыць і даведацца, які ў мяне максімальны вынік у спорце. І, перакананы, дзяржаўная ўзнагарода мне толькі дадасць матывацыі. Не магу абяцаць і загадваць яшчэ вынікі і медалі. Але буду старацца выступаць лепей ад старту да старту», — прызнаўся Ігар Бокій.

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па скачках на батуце Вольга УЛАСАВА ўзнагароджана ордэнам Айчыны I ступені. Трэнер двухразовага алімпійскага чэмпіёна Івана Літвіновіча і сярэбранага прызёра Віялеты Бардзілоўскай падзялілася сваім сакрэтам поспеху: «Трэба вельмі любіць сваю працу. Калі чалавек знаходзіцца на сваім месцы, тады ўсе цяжкасці пераадольныя». Вольга Уласава адзначыла, што ўзнагарода з рук Прэзідэнта — найлепшае прызнанне. «У такія моманты я разумею, што ўсё раблю не дарма. Краіна гэта ведае, цэніць. І для краіны я гатова яшчэ больш працаваць», — падзялілася яна. Ужо на наступным тыдні Іван Літвіновіч і Віялета Бардзілоўская вернуцца да спаборніцтваў. Па словах трэнера, гэта асабістае жаданне спартсменаў.

Старшы трэнер нацыянальнай каманды па цяжкай атлетыцы Валерый СІЗЯНОК, які падрыхтаваў бронзавага прызёра Алімпійскіх гульняў Яўгена Ціханцова, цяпер заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь. «Вельмі прыемна, што наш Прэзідэнт удзяліў нам увагу і ў такі святочны дзень узнагародзіў нас, і трэнераў, і спартсменаў, такімі высокімі ўзнагародамі. Кожны медаль спартсмен і трэнер здабываюць потам і крывёю», — расказаў ён. А тым часам доўга цяжкаатлетам адпачываць не давялося: па словах Валерыя Сізянка, не за гарамі наступныя Алімпійскія гульні. Таму спартсмены і іх трэнерскі штаб ужо пачалі новы алімпійскі цыкл. Каляндар спаборніцтваў насычаны. Натхнення дадаў і бронзавы медаль Яўгена Ціханцова. «Жэня паказаў сябе як лідар каманды. Ён прызёр чэмпіянату свету, чэмпіён Еўропы — гэта вялікае дасягненне. Ён праявіў сябе выдатна, прынёс медаль і Алімпійскіх гульняў. І сёння ён падае прыклад маладым спартсменам», — адзначыў Валерый Сізянок.

Парламенцкі дзённік

ЗАНЯТАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА, РАЗВІЦЦЁ АВІЯПРАМЫСЛОВАСЦІ І ЎДАСКАНАЛЕННЕ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

Падчас адкрыцця другой сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання дэпутаты разгледзелі шэсць законапраектаў

Сімвалічна, што, згодна з Канстытуцыяй, парламентарыі прыступілі да актыўнай заканадаўчай работы ў Дзень народнага адзінства. Адчуць гістарычны момант дзяржаўнага свята, яго важнасць у сучасных рэаліях можна было ў холе Авальнай залы, дзе размясцілася выстаўка матэрыялаў унікальнага навукова-папулярнага выдання «Беларусь адзіная», прысвечанага 85-годдзю ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР.

БЕСПРАЦОЎЕ ЗНІЖАЕЦЦА, А ПОПЫТ НА КАДРЫ РАСЦЕ

Пасля выступлення Старшыні Палаты прадстаўнікоў, у якім Ігар Сергяенка сфармуляваў прыярытэтныя кірункі работы дэпутацкага корпуса на бягучую сесію, парламентарыі прыступілі да абмеркавання законапраектаў. Адзін з іх — «Аб змяненні законаў па пытаннях занятасці насельніцтва» — дэпутаты прынялі ў другім чытанні. У прыватнасці, праектам закона прадугледжана ўстанаўленне фіксаванага памеру дапамогі па беспрацоўі і ўвядзенне дадатковых патрабаванняў для яго атрымання. Скароціцца перыяд знаходжання беспрацоўных і грамадзян, якія звярнуліся па пытаннях працаўладкавання, на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. У грамадзян з'явіцца больш магчымасцяў у атрыманні садзейнічання службы занятасці ў пошуку работы, а ў наймальнікаў — у падборы кадраў.

Як расказала **старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Ірына КАСЦЕВІЧ**, Беларусь узяла курс на актыўную палітыку занятасці, прынцып якой — дастаткова хутка дапамагчы чалавеку знайсці работу. «Сітуацыя на рынку працы даволі неардынарная, — звярнула ўвагу дэпутат. — Узровень беспрацоўя — усяго 3 %, гэта нізкі ўзровень, і, як кажуць эксперты ў галіне эканамічнай навукі, фактычна гэта поўная занятасць. І ў той жа час колькасць вакансій у нас расце. Гэта сведчыць аб тым, што прапанова скарачаецца, а попыт на працоўную сілу з боку наймальнікаў расце».

Зыходзячы менавіта з гэтай сітуацыі, удасканальваецца праект закона аб занятасці, які вырашае задачы дзяржавы, наймальніка і чалавека. Цяпер неабавязкова будзе ісці ў службу занятасці, каб зарэгістравацца ў якасці таго, хто мае патрэбу ў працаўладкаванні, гэта можна зрабіць дзякуючы электроннаму інфармацыйнаму рэсурсу. Для людзей з інваліднасцю, грамадзян перадпенсіённага ўзросту і тых, хто з-за алкагольнай залежнасці страціў сувязь з рынкам працы, уводзіцца механізм браніравання працоўных месцаў.

НОВЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ

Дэпутаты ратыфікавалі Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб распрацоўцы і арганізацыі серыйнай вытворчасці двухрухавіковага лёгкага мнагамэтавага самалёта «Асвей». Як адзначыў **старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Дзмітрый ПАНТУС**, ужо сёння можна казаць аб тым, што Беларусь знаходзіцца ў адным кроку ад уступлення ў шэраг краін, якія валодаюць кампетэнцыямі ў галіне авіябудавання. «Рэалізацыя праекта «Асвей» прадугледжвае два этапы, — канкрэтызаваў ён. — Першы — выкананне самой доследна-канструктарскай работы па распрацоўцы лёгкага мнагамэтавага самалёта, а таксама рэалізацыя на тэрыторыі 558-га авіярамонтнага завода ў Баранавічах інавацыйнага праекта па арганізацыі вытворчасці ў Рэспубліцы Беларусь самалётаў, дэталяў і зборачных адзінак для шматлікіх тыпаў самалётаў».

Па словах Дзмітрыя Пантуса, самалёт «Асвей» разлічаны на перавозку 19 пасажыраў, прызначаны для авіяперавозак па месцы і рэгіянальных паветраных лініях. «Эксплуатавацца самалёт можа як пасажырскі, а таксама як грузапасажырскі, — дадаў ён. — У беларуска-расійскага самалёта будуць палепшаныя характарыстыкі. Акрамя таго, самалёт можа эксплуатавацца на аэрадромах з узлётна-пасадачнымі палосамі як са штучным, так і грунтавым пакрыццём. Самалёт будзе мнагамэтавы і прызначаны ў тым ліку для выкарыстання санітарнымі службамі, службамі МНС, патрулявання, дэсантавання і выкіду парашутыстаў. Такім чынам, гэта будзе ўніверсальны самалёт».

Як звярнуў увагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Руслан КАСЫГІН**, размова ідзе аб сумесным маштабным стратэгічным праекце, рэалізацыя якога забяспечыць выхад Рэспублікі Беларусь на ўзровень краін, якія рэалізоўваюць задачы ўласнай авіябудаўнічай прамысловасці. «Задача глабальная, амбіцыйная, але разам з тым, як паказвае практыка, для Рэспублікі Беларусь невырашальных задач не існуе, — падкрэсліў дэпутат. — Сумесна з Расійскай Федэрацыяй мы рэалізавалі стратэгічную глабальную задачу, і сёння наша краіна ўваходзіць у пералік касмічных дзяржаў. Наступны крок — авіяцыйная задача, і мы з ёй паспяхова справімся. Рэалізацыя гэтага маштабнага стратэгічнага праекта будзе садзейнічаць забеспячэнню нацыянальнай бяспекі, тэхналагічнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Гэта яшчэ адно пацвярджэнне, што заходнія санкцыі ў адносінах Беларусі і Расіі бесперспектыўныя і правалены поўнасцю».

Таксама ратыфікавана Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб парадку прызнання электроннага подпісу (электроннага лічбавага подпісу) у электронным дакуменце пры трансгранічным электронным узаемадзеянні.

ПАКАРАННІ — СКАРЭКЦІРАВАЦЬ І ЗМЯГЧЫЦЬ

У другім чытанні дэпутаты разгледзелі законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях і органаў фінансавых расследаванняў». Прапаноўваецца ўстанавіць аднастайны і адназначны тэрміналагічны апарат, вызначыць катэгорыі ваенных пенсіянераў, умовы і парадак іх пенсіённага забеспячэння ў Рэспубліцы Беларусь пасля выхаду нашай краіны з міжнародных дагавораў аб сацыяльным забеспячэнні, якія ў цяперашні час рэгулююць гэтую сферу грамадскіх адносін.

Таксама ў другім чытанні прыняты законапраект «Аб акрэдытацыі ў Нацыянальнай сістэме акрэдытацыі Рэспублікі Беларусь», у першым — праект Закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці». Перагледжаны санкцыі 97 саставаў злачынстваў. Санкцыі 65 саставаў прапаноўваецца дапоўніць альтэрнатыўнымі, больш мяккімі, відамі пакаранняў, санкцыі 32 саставаў — скарэкціраваць у частцы памеру пакаранняў або ўвядзення на альтэрнатыўнай аснове дадатковых пакаранняў (штраф, пазбаўленне права).

У прыватнасці, прапаноўваецца вызначыць, што жанчынам і адзінокім мужчынам, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў або дзяцей-інвалідаў, а таксама інвалідам першай групы, якія ўпершыню здзейснілі злачынства, што не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства, што не спалучана з прымяненнем гвалту або пагрозай яго прымянення, пазбаўленне волі не прызначаецца. Аналагічную форму прапаноўваецца замацаваць у адносінах да асоб, якія ўпершыню здзейснілі ўказаныя злачынствы ва ўзросце да 18 гадоў. Выключэнне — асобы, якія здзейснілі злачынства экстрэмісцкай накіраванасці.

Вераніка КАНЮТА.

Законы павінны быць справядлівымі і прымацца ў імя людзей

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паспяхова адбылося першае пасяджэнне VII Усебеларускага народнага сходу — у яго новым канстытуцыйным статусе. Наш Прэзідэнт выбраны Старшынёй гэтага вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя Рэспублікі Беларусь, а ўсе члены Савета Рэспублікі сталі дэлегатамі. Сёлета мы адсвяткавалі 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 30-годдзе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і інстытута прэзідэнцтва, будзем адзначаць 25-годдзе з дня падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

І гэта ўсё — у год, аб'яўлены ў Беларусі Годам якасці, што не толькі вызначае накіраванасць нашай работы ў будучую сесію, але і абсалютна адпавядае агульнаму духу палітычнай, дзяржаўнай і грамадскай дзейнасці ў нашай краіне.

У ходзе будучай сесіі намаганні Савета Рэспублікі будуць накіраваны перш за ўсё на рэалізацыю мэтавых установак Паслання кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь, якое ўпершыню ў гісторыі суверэннай рэспублікі прагучала з трыбуны Усебеларускага народнага сходу, даручэнняў нашага Прэзідэнта. Нам трэба непасрэдна ўдзельнічаць у рэалізацыі дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі на 2021—2025 гады і распрацоўваць праграму наступнай пяцігодкі, актыўна прасоўваць і абараняць нацыянальныя інтарэсы нашай краіны на сусветнай арэне.

Заканатворчая работа Савета Рэспублікі працягне прытрымлівацца эвалюцыйнага шляху развіцця беларускай прававой сістэмы пры поўным выкананні прынцыпаў паступальнасці, планамернасці і сістэмнасці заканадаўчага працэсу. Галоўнае ў гэтай рабоце — законы павінны быць справядлівымі, ісці ад жыцця і прымацца ў імя людзей, у імя кожнага чалавека.

У ходзе другой сесіі плануецца разгледзець блок законапраектаў, якія рэгулююць сацыяльна-эканамічную сферу. Павышэнне гарантый для ўразлівых катэгорый грамадзян, забеспячэнне магчымасці працаваць і зарабляць кожнаму, хто хоча плённа працаваць, — усё гэта прадмет клопату дзяржавы і, адпаведна, парламента. Пры гэтым неабходна ўсяляк спыняць утрыманства, выхоўваць у грамадства разуменне: для таго, каб жыць добра, трэба працаваць.

Пры рабоце над карэкціроўкай Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі неабходна выходзіць перш за ўсё з задач, пастаўленых нашым Прэзідэнтам на Рэспубліканскім педагагічным савеце. Гэта — павышэнне прэстыжу педагагічнай работы, удасканаленне сістэмы падрыхтоўкі кадраў, прыцягненне высокаматываваных і творчых педагогаў, падрыхтоўка спецыялістаў будучыні, узмацненне выхаваўчай функцыі адукацыі.

Упершыню на разгляд Савета Рэспублікі будзе прадстаўлены новы кодэкс аб ахове здароўя. Шырокай тлумачальнай работы патрабуе ўнесены кіраўніком дзяржавы праект Закона «Аб зменах кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці», які накіраваны на забеспячэнне больш індывідуальнага падыходу да крымінальнай адказнасці кожнага грамадзяніна. Мы ўжо актыўна ўключыліся ў гэтую работу.

Нам, парламентарыям, трэба працаваць хутка, дакладна і высокапрафесійна. Думаць трэба глыбока і маштабна, стратэгічна. Сёння па-іншаму нельга. Ад нашай работы шмат у чым залежыць далейшая пабудова моцнай, незалежнай і квітнеючай Беларусі.

Адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці Савета Рэспублікі, вызначаны VI Усебеларускім народным сходам і кіраўніком дзяржавы, — фарміраванне эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі, узмацненне ролі мясцовага кіравання і самакіравання ў забеспячэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, непасрэднае ўключэнне іх у выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы, якія датычацца эканомікі і сацыяльнай сферы. Людзі павінны мець адпаведныя ўмовы для жыцця ў любым кутку нашай краіны.

Добрай практыкай стала правядзенне выязных пашыраных пасяджэнняў Прэзідыума Савета Рэспублікі, у ходзе якіх шырокім прадстаўнічым складам разглядаюцца надзённыя і актуальныя для грамадства пытанні. У мэтах узмацнення каардынацыі Саветам Рэспублікі работы дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў праводзяцца выязныя дыялогавыя пляцоўкі з дэпутацкім корпусам. Да канца года плануецца правесці цыкл такіх мерапрыемстваў ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Безумоўна, найважнейшы маркер сацыяльнай стабільнасці — своечасовая выплата заработнай платы ў арганізацыях. Кожнаму члену Савета Рэспублікі для належнага маніторынгу і ацэнкі сітуацыі неабходна мець поўны пералік суб'ектаў гаспадарання, якія маюць праблемы з выплатамі заработных плат, уключаючы несвоечасовае, няпоўнае налічэнне або ніжэйшае за сярэдняе ў раёне, а таксама трымаць на кантролі арганізацыі, якія нясуць страты і знаходзяцца ў стадыі ліквідацыйнай вытворчасці. На асаблівым кантролі павінны быць пытанні функцыянавання сацыяльных аб'ектаў у рэгіёнах, даступнасці і якасці аказання медыцынскай дапамогі, наяўнасці прымальных транспартных зносін. Неабходна прадоўжыць маніторынг спажывецкага рынку і кантроль за цэнавай сітуацыяй ва ўсіх рэгіёнах, з улікам бягучай стабільнасці цэн робячы акцэнт на насычэнні рынку таварамі і задавальненні спажывецкага попыту насельніцтва, а таксама прадстаўленасці айчыннай прадукцыі ў магазінах, асабліва буйных гандлёвых сетках. Рабоце з насельніцтвам і ў рэгіёнах неабходна ўдзяляць самую пільную ўвагу.

У цяперашняй геапалітычнай сітуацыі, якая характарызуецца неспадзяванай эскалацыяй напружанасці, канфрантацыі і татальнай агрэсіі, выключна важна няўхільна прытрымлівацца спрадвечнай цывілізацыйнай місіі беларускай дзяржавы — выступаць донарам міру і бяспекі як неад'емных умоў і гарантый стваральнага развіцця Вялікай Еўразіі ў цэлым. Сёння трэба выкарыстоўваць усе магчымасці для ўмацавання канструктыўных сувязяў з ключавымі цэнтрамі сілы і геапалітычнымі гульцамі, напаўняць рэальным зместам дамоўленасці з дзяржавамі-партнёрамі, настойліва даводзіць свету пазіцыю нашай краіны аб непрымальнасці дэстабілізацыі сітуацыі і аб мірных, аб'яднальных намаганнях, якія прыкладаюцца, пастаянна пашыраючы кола аднадумцаў. Гэта перш за ўсё наша з вамі — парламенцкая — адказнасць.

Хоць шмат што ў свеце змяняецца, наш гістарычны выбар нязменны. Саюзнае будаўніцтва з брацкай Расіяй было, ёсць і застаецца ключавым стратэгічным кірункам для транспарэнтнай, адказнай, шматвектарнай знешняй палітыкі Беларусі. Важкі ўклад у беларуска-расійскае супрацоўніцтва ўносіць Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які стымулюе сумесную паслядоўную работу ў гандлёва-эканамічнай, інвестыцыйнай, гуманітарнай сферах.

Істотны задзел зроблены ў развіцці супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай па парламенцкай лініі, пытаннях жаночага парадку дня і маладзёжнай палітыкі. Створаны ў ходзе нядаўняга візіту ў Кітай Камітэт высокага ўзроўню мае значны патэнцыял у справе ўмацавання міждзяржаўнага і міжпарламенцкага дыялогу, садзейнічання эфектыўнай рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых бакамі на найвышэйшым і высокім узроўнях. У мэтах выканання даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь мы прапанавалі кітайскім калегам правесці Форум рэгіёнаў Беларусі і Кітая ў нашай краіне, вызначэнне канцэпцыі і змястоўнае напаўненне якога нам з вамі трэба будзе адпрацаваць у найбліжэйшы час.

Па ініцыятыве беларускага боку прынята рашэнне аб павышэнні ўзроўню ўзаемадзеяння паміж верхнімі палатамі парламентаў Беларусі і Узбекістана — стварэнні Міжпарламенцкай камісіі ў дадатак да дзеючых груп дружбы, у тым ліку для ажыццяўлення парламенцкага маніторынгу выканання дамоўленасцяў, дасягнутых на найвышэйшым і высокім узроўнях.

У наступны перыяд варта актывізаваць кантакты з краінамі «далёкай дугі», у якія нядаўна былі рэалізаваны дзяржаўныя візіты, — Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Іран, Зімбабвэ, Экватарыяльная Гвінея, Кенія, Манголія. Нам трэба прадоўжыць нарошчваць супрацоўніцтва з парламентамі дружалюбных дзяржаў, паглыбляць узаемадзеянне з членамі ШАС і БРІКС, прасоўваць ідэю аб фарміраванні ў ШАС парламенцкага вымярэння і інстытуалізацыі такога ў БРІКС, заахвочваць фармат парламенцкага ўдзелу БРІКС-плюс. Значным фактарам далейшага збліжэння з гэтымі аб'яднаннямі і іх удзельнікамі з'яўляецца паслядоўная рэалізацыя вылучаных намі ініцыятыў і дасягнутых дамоўленасцяў.

Мы рашуча настроены даводзіць да сусветнай супольнасці праўду пра суверэнную Беларусь і яе поспехі. На ўмацаванне, абарону і забеспячэнне пераемнасці сапраўдных гуманістычных ідэалаў і агульначалавечых каштоўнасцяў, увасабленне ў жыццё адзіна правільнай філасофіі чалавечага суіснавання «Свету — мір» накіраваны нашы намаганні па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. У тым ліку — у рамках удзелу беларускай дэлегацыі на чале з Нацыянальным каардынатарам у Саміце будучыні, які адбудзецца найбліжэйшым часам у Нью-Ёрку.

Як паказваюць міжнародныя візіты і сустрэчы, сёння цікавасць да Беларусі ва ўсім свеце вельмі высокая. Перш за ўсё гэта, безумоўна, заслуга Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, шаноўнага Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі: усюды нашага лідара паважаюць, з ім лічацца, да яго прыслухоўваюцца. Кіраўнік дзяржавы нам усім — парламенту, ураду, мясцовым органам улады, бізнесу і грамадскім структурам — адчыніў дзверы практычна ў любую краіну, ва ўсе рэгіёны і кантыненты свету.

У сучасных рэаліях зусім няпроста захаваць сябе як суверэнную дзяржаву, як народ, як самастойную нацыю. Гэта магчыма толькі з апорай на традыцыі, гісторыка-культурную і духоўную спадчыну, у тым ліку і сапраўдныя каштоўнасці веры. Напярэдадні Дня маці і праваслаўнага свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы запланавана правядзенне маштабнага мерапрыемства «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава» ў Полацку, дзе будуць абмеркаваны пытанні ўмацавання сацыяльнага статусу сям'і і папулярызацыі традыцыйных сямейных каштоўнасцяў у беларускім грамадстве, духоўна-маральнага выхавання моладзі, дэмаграфічнай бяспекі краіны і іншыя актуальныя праблемы. Гэта сумесная ініцыятыва Савета Рэспублікі і Беларускай праваслаўнай царквы, якая была рэалізавана ўпершыню ў 2023 годзе.

Асаблівая ўвага Саветам Рэспублікі ўдзяляецца ўзаемадзеянню з моладдзю. Члены Маладзёжнага савета рэгулярна запрашаюцца на мерапрыемствы Савета Рэспублікі, нашы маладыя калегі практычна заўсёды побач з намі. Каб не проста навучыць іх працаваць у парламенце, а насыціць іх сваімі ідэямі, стаўленнем да нашай краіны і народа. Традыцыйна ў фокусе ўвагі Савета Рэспублікі знаходзяцца пытанні маладзёжнага парадку дня, уключаючы рэалізацыю такіх знакавых праектаў, як «Цягнік Памяці», канікулярная прафарыентацыйная школа «За бяспеку!», а таксама «Дзеці Садружнасці», які ў 2025 годзе прыме Беларусь.

Рэспубліка Беларусь нязменна застаецца месцам, дзе хочацца жыць, вучыцца, працаваць, выхоўваць дзяцей. На беларускай зямлі ў міры і згодзе жывуць людзі розных веравызнанняў, рэлігій, нацыянальнасцяў, этнічнай і расавай прыналежнасці, знаходзяць другі дом выхадцы з замежных краін. І гэта дарагога варта.

Няхай народнае адзінства заўсёды застаецца трывалай асновай стабільнасці, дабрабыту і працвітання нашага грамадства, крыніцай найвялікшай духоўнай сілы і адданасці сваёй Айчыне для будучых пакаленняў беларусаў. Менавіта той пуцяводнай зоркай, якая будзе аберагаць і весці нас у шалёным віры сусветнай гісторыі.

У парламенцкім партфелі нязначных пытанняў няма

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цяпер аб стратэгіі будучай работы, аб задачах на найбліжэйшую перспектыву.

У заканадаўчай сферы асноўным прыярытэтам для нас застаецца стварэнне ўмоў для дынамічнага развіцця эканомікі і павышэння дабрабыту народа.

Важную ролю тут іграе падрыхтоўка пакета бюджэтна-падатковых дакументаў. Па-першае, бюджэтна-падатковая палітыка павінна садзейнічаць устойлівасці эканомікі, нарошчванню вытворчага патэнцыялу і прытоку інвестыцый у тэхналогіі заўтрашняга дня. Другое — захаванне сацыяльнай накіраванасці бюджэту. Па-ранейшаму ў прыярытэце павінна застацца падтрымка шматдзетных сем'яў, пажылых людзей, інвалідаў.

Працягваючы тэму сацыяльнай абароны, зазначу, што на сесіі плануецца разгледзець шэраг дакументаў па пытаннях ветэранаў, занятасці насельніцтва, дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, пенсіённага забеспячэння і некаторыя іншыя. Яшчэ адно прынцыповае пытанне парадку дня сесіі, якое выклікае жывую цікавасць у грамадзян, — удасканаленне крымінальнага заканадаўства.

У парламенцкім партфелі дробных, нязначных пытанняў няма. Усе яны закранаюць актуальныя тэмы. Таму кожнае рашэнне, якое датычыцца правоў і законных інтарэсаў грамадзян, павінна быць дакладна выверана.

У гэтых мэтах намі запланавана правядзенне шэрагу мерапрыемстваў. Так, у найбліжэйшы час у ходзе семінара ў Брэсцкай вобласці будуць разгледжаны пытанні правапрымяняльнай практыкі рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў і работы службы «адно акно». У лістападзе адбудуцца парламенцкія слуханні па развіцці лічбавага права.

Прэзідэнтам пастаўлена задача актывізаваць работу на знешнім контуры. Усе нашы міжнародныя кантакты, візіты павінны быць арыентаваны на канкрэтныя вынікі, тым больш што большасць парламентаў свету гатовы супрацоўнічаць з Нацыянальным сходам Беларусі.

Наша задача — сканцэнтравацца на рэалізацыі дасягнутых двухбаковых дамоўленасцяў, асабліва па пытаннях эканамічнага характару. Тут шырокае поле дзейнасці для дэпутацкага корпуса і пастаянных камісій.

Безумоўным прыярытэтам з'яўляецца ўмацаванне ўзаемадзеяння з Расійскай Федэрацыяй. Нам неабходна больш шырока задзейнічаць патэнцыял Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, перш за ўсё з мэтай вырашэння задач па стварэнні адзінага энергетычнага рынку і інфармацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы.

Наступны важны кірунак — СНД. Імкненню Захаду падзяліць нашы краіны парламентарыі павінны супрацьпаставіць сумесную работу па абароне агульных каштоўнасцяў, агульнай гісторыі, развіццю эканамічных і гуманітарных сувязяў.

Асаблівую значнасць з улікам цяперашняй ваенна-палітычнай сітуацыі і абароны нацыянальных інтарэсаў Беларусі мае работа ў Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Беларусь старшынствуе ў геапалітычнай групе «Еўразія» ў Міжпарламенцкім саюзе. Удзел у 149-й Асамблеі МПС у Жэневе неабходна выкарыстоўваць для навядзення мастоў, дэманстрацыі бесперспектыўнасці палітыкі незаконных эканамічных санкцый. Трэба пашыраць кола сяброў Беларусі, у тым ліку сярод краін — удзельніц ШАС, БРІКС, здольных стаць надзейнымі партнёрамі ў справе фарміравання шматпалярнага і справядлівага свету.

Важна прасоўваць тэзіс аб адкрытасці нашай краіны да дыялогу. Неабходна напоўніць работу груп сяброўства рэальным зместам, каб яны сталі дзейсным механізмам рэалізацыі знешнепалітычнага курсу. Пасыл кіраўніка дзяржавы аб развіцці народнай дыпламатыі павінен стаць асновай нашай дзейнасці.

Некалькі слоў аб дзейнасці ў выбарчых акругах. Абазначу тры асноўныя кірункі. Першае — сістэмная, уважлівая работа па разглядзе зваротаў грамадзян. Ніякага фармалізму і цяганіны быць не павінна. Другое — інфармацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы. Людзі павінны атрымліваць аб'ектыўную інфармацыю аб дзяржаўнай палітыцы, аб тым, што робіцца для захавання суверэнітэту, і разумець, што лёс Беларусі сёння залежыць ад грамадзянскай пазіцыі кожнага. Патрыятызм трэба даказваць канкрэтнымі справамі, згуртаванай і энергічнай працай! Трэцяе — аналіз сітуацыі ў рэгіёнах, інфармаванне кіраўніцтва краіны аб наяўных праблемах і магчымых шляхах іх вырашэння.

Цяперашні сесійны перыяд асабліві. Менавіта Палаце прадстаўнікоў трэба будзе прыняць рашэнне аб назначэнні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта найважнейшая грамадска-палітычная кампанія завершыць працэс канстытуцыйных пераўтварэнняў, накіраваны на ўмацаванне асноў народаўладдзя.

Выбары павінны прайсці ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, адкрыта і арганізавана, а іх вынікі — стаць магутным фактарам кансалідацыі грамадства. Упэўнены, што дэпутацкі корпус разам са сваімі выбаршчыкамі зробіць усё, каб паспяхова выканаць задачы, якія ставіць перад намі час!

Поўныя тэксты выступленняў чытайце на сайце zviazda.by

Радасць для ўсіх

У Дзень народнага адзінства улады сталіцы віншавалі жанчын, якія нарадзілі дзетак напярэдадні — у Дзень горада Мінска. 14 верасня ў сталіцы на свет з'явіліся 36 дзяцей: 20 хлопчыкаў і 16 дзяўчынак. 25 мінчанак зведалі радасць мацярынства ўпершыню. **Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ** учора віншаваў мацярэй у радзільным доме 5-й гарадской клінічнай бальніцы, дзе ў Дзень горада нарадзіліся шасцёра маленькіх мінчан.

На фота — Анастасія Прохарава з дачкой Аліяй, якая разам з яшчэ чатырма дзяўчынкамі і трыма хлопчыкамі з'явілася на свет у радзільні пры 6-й гарадской клінічнай бальніцы. Тут маладых мам віншавалі **памочнік Прэзідэнта, інспектар па Мінску Юрый ФРАЛОЎ, намеснік старшыні камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Дзмітрый ЦІХАНАЎ, галоўны ўрач 6-й ГКБ Мінска Віктар АНОСАЎ** і іншыя супрацоўнікі радзільнага дома.

Акцыя «Прывітанне, мінчанін!» доўжылася ўвесь дзень у розных медустановах Мінска. Усе гераіні акцыі атрымалі каштоўныя падарункі.

Фота Віктара ДРАЧОВА.

Гонар за зробленае

Яшчэ напярэдадні знамянальнай даты ў Магілёве была адкрыта траса-дублёр вуліц Якубоўскага — Загарадная шаша, якая разгрузіць гарадскія вуліцы ад транзітнага транспарту. А непасрэдна ў дзень свята ў Шклове ўрачыста адкрылася цалкам абноўленая цэнтральная раённая бальніца.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА, які прыняў удзел у яе адкрыцці, адзначыў, што сацыяльна-арыентаваная палітыка, якая праводзіцца ў нашай краіне, прадугледжвае стварэнне камфортных умоў для грамадзян. І асабліва прыемна рабіць такія падарункі да свята народнага адзінства. Мадэрнізацыя ўстановы працягвалася восем месяцаў, на новых плошчах устаноўлена каля 80 адзінак сучаснага абсталявання. Гэта камп'ютарны тамограф, лапараскапічная стойка, эндаскапічнае абсталяванне, апараты ШВЛ, стаматалагічныя ўстаноўкі і іншыя. Пасля адкрыцця кабінета камп'ютарнай тамаграфіі гэты метад дыягностыкі стаў даступны пацыентам з Бялыніцкага, Дрыбінскага, Горацкага і Круглянскага раёнаў.

У Чэрыкаве да Дня народнага адзінства магілёўскае ААТ «Магатэкс» адкрыла новы швейны ўчастак. Першапачаткова тут будзе працаваць 40 швачак. Яны будуць шыць спецадзенне для работнікаў прадпрыемства. Гэта другі па ўліку ўчастак, які адкрывае «Магатэкс». Першы з'явіўся ў Быхаве 13 гадоў таму.

У Магілёўскім раёне святу прысвяцілі адкрыццё рэсурснага цэнтра грамадска-патрыятычнага выхавання. Ён адкрыўся на базе Васходаўскай сярэдняй школы. У рамках мерапрыемства адбылася пасадка туі як сімвала дрэва адзінства і квэст-гульня «Беларусь — краіна адзінства». Удзел у мерапрыемстве прынялі навучэнцы, пераможцы конкурсаў «Зарніца», «Зарнічка», кіраўнікі ўстаноў адукацыі, прадстаўнікі райвыканкама, райваенкамата, грамадскіх арганізацый.

— Мы зрабілі базу для ўсіх дзяцей Магілёўскага раёна, — паведаміла **дырэктар Цэнтра творчасці і моладзі Магілёўскага раёна Ларыса ГАЛЯНТАВА.** — У кабінеце сабраны наглядныя дапаможнікі па ваеннай падрыхтоўцы, патрыятычным выхаванні, шмат краязнаўчага матэрыялу па Магілёўскім раёне, ваеннай гісторыі. Будзем запрашаць да сябе навучэнцаў па суботах, арганізоўваць для іх сустрэчы з ратавальнікамі, ваеннымі.

Падчас мерапрыемства заслужаным людзям былі ўручаны нагрудныя знакі да стагоддзя ўтварэння Магілёўскага раёна. Урачыста была адкрыта памятная дошка ў гонар дырэктараў Вільчыцкай школы, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. На адкрыцці прысутнічалі іх нашчадкі.

У Магілёве ў гэты дзень на плошчы Адзінства адбылося некалькі святочных праграм. У іх бралі ўдзел салісты Магілёўскай гарадской капэлы і магілёўскія артысты.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Магілёўскага раёна.

НАМ МНОГАЕ ПАД СІЛУ

Святкаванне Дня народнага адзінства ў Брэсце пачалося з урачыстага мітынгу, які прайшоў на вуліцы Леніна, каля ўвахода ў Брэсцкі парк культуры і адпачынку. На мітынг прыйшло шмат людзей.

Спачатку прадстаўнікі органаў улады, грамадскіх і маладзёжных арганізацый, дэпутаты ўсклалі кветкі да помніка на месцы пахавання воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў 1939 годзе за аднаўленне адзінства беларускага народа. Усе ўдзельнікі мітынгу ўшанавалі памяць вызваліцеляў хвілінай маўчання.

Перад гараджанамі выступіў **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Сяргей ЛАБАДЗІНСКІ.** Ён павіншаваў са святам, падкрэсліў значнасць адзінства нашага народа і заклікаў да еднасці ў стваральнай працы на карысць светлай будучыні. Кіраўнік горада падкрэсліў, што Брэст — шматнацыянальны і шматканфесійны горад: «Мы жывём мірна, сяброўскі. Дарэчы, у Брэсце пражываюць прадстаўнікі 17 канфесій, 75 нацыянальнасцяў».

У гэты ж дзень на будынках дзвюх брэсцкіх школ былі ўрачыста адкрыты мемарыяльныя дошкі ў гонар людзей, чые імёны носяць школы. У сярэдняй школе № 23 адкрылі мемарыяльны знак у гонар Героя Савецкага Саюза Пятра Гаўрылава, а ў школе № 35 з'явілася дошка, прысвечаная Маршалу Савецкага Саюза Канстанціну Ракасоўскаму.

У кожным горадзе і раёне Брэстчыны прайшлі свае мерапрыемствы ў гонар Дня народнага адзінства. Абласное свята гэтым разам адбылося ў Кобрыне. Урачыстасці пачаліся пасадкай алеі ў скверы імя герояў-танкістаў. Дрэвы пасадзілі ўдзельнікі нарады-сустрэчы маладога кадравага рэзерву Брэсцкай вобласці. Затым у сярэдняй школе № 2 адкрылі раённы цэнтр дапрызыўнай падрыхтоўкі «Адзінства».

Вуліца Суворава ў Кобрыне стала месцам работы канцэртных і гандлёвых пляцовак, выставак устаноў культуры і адукацыі, прамысловых прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый. Увечары каля помніка воінам-вызваліцелям адбыўся ўрачысты мітынг.

— Сёння, як ніколі, мы разумеем, што менавіта гэтая сіла, сіла народнага адзінства, выратавала нашу краіну ў вайне з фашысцкімі акупантамі, якія планавалі знішчыць беларусаў, — сказаў, звяртаючыся да ўдзельнікаў мітынгу, **першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый ГАРАДЗЕЦКІ.** — Разам мы пераадолелі суровыя выпрабаванні перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннай галечы, пабудавалі суверэнную краіну і на працягу трыццаці гадоў самі вырашаем лёс сваёй Радзімы.

Віцэ-губернатар гаварыў аб тым, як развіваецца народная гаспадарка рэгіёна, як прыгажэюць нашы райцэнтрры і аграгарадкі. «Гэта найлепшае сведчанне таго, што разам нам пад сілу нават самыя амбіцыйныя праекты. Галоўнае, каб яны былі накіраваны на карысць людзей і рабілі нашу краіну яшчэ больш моцнай і непераможнай», — падсумаваў Дзмітрый Гарадзецкі.

Завяршылася святкаванне вялікім канцэртам у Палацы культуры.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Брэсцкага гарвыканкама.

АКЦЭНТ НА ЗДАРОЎІ

Першым мерапрыемствам у святкаванні Дня народнага адзінства ў Гродне стаў мітынг «Беларусь адзіная» на Кургане Славы. Сёлета споўнілася 55 гадоў з перыяду закладкі мемарыяльнага аб'екта. Пасля мітынгу кіраўніцтва вобласці і медыцынская грамадскасць узялі ўдзел у адкрыцці адноўленага хірургічнага комплексу ўніверсітэцкай клінікі.

Мадэрнізацыя і капітальны рамонт дзевяціпавярховага лячэбнага корпуса сталі важным этапам развіцця аховы здароўя Гродзенскага рэгіёна. На гэтыя мэты з абласнога бюджэту было накіравана каля 20 мільёнаў рублёў.

Дзякуючы рэканструкцыі, значна палепшыліся ўмовы аказання медыцынскай дапамогі і яе даступнасці ва ўсіх аддзяленнях хірургічнага корпуса, у тым ліку трансплантацыі, пластычнай і эндакрыннай хірургіі, траўматолага-артапедычным аддзяленні, сасудзістай хірургіі, аддзяленні гемадыялізу.

Аб'ект быў унесены ў абласную інвестпраграму на 2022—2024 гады. Летась у якасці спонсарскай дапамогі больш за 4,5 мільёна рублёў на будаўніцтва ахвяраваў ААТ «Гродна Азот». Такое рашэнне было прынята канцэрнам «Белнафтахім».

Фота Бел.ТА.

Гэтыя сродкі асвоены ў поўным аб'ёме на правядзенні будаўніча-мантажных работ, а таксама выкарыстаны пры набыцці медыцынскага абсталявання і медыкаментаў. Адноўлены корпус поўнасцю падрыхтаваны для прыёму пацыентаў.

Пасля ўрачыстага адкрыцця **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК** сустрэўся з маладымі спецыялістамі ўніверсітэцкай клінікі ў рамках дыялогавай пляцоўкі.

Падарункам гораду да Дня народнага адзінства стаў і шматфункцыянальны сілавы комплекс, які размешчаны побач са стадыёнам СШ № 34 Гродна. Сучасная спартыўная зона створана па ініцыятыве мясцовага дэпутата пры падтрымцы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба і аддзела адукацыі Гродзенскага гарвыканкама. Тут прадугледжана зона для варкаўта, баскетбола і заняткаў людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Аматары спорту на «Сцежцы здароўя» ў гарадскім урочышчы Пышкі змаглі паўдзельнічаць у патрыятычным «Прабегу адзінства». Да акцыі далучыліся людзі розных пакаленняў, сёлета забег стаў адным з самых масавых.

Таксама ў гэты дзень у выставачнай зале «Фестывальны» адкрылася выстаўка «Наша Беларусь», прымеркаваная да 85-годдзя аб'яднання Заходняй Беларусі і БССР.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

З ГІСТОРЫІ ВЫРАСТАЕ СУЧАСНАСЦЬ

Аўта- і велапрабегамі па месцах баявой славы, ушанаваннем сучаснікаў, флэшмобамі і пасадкай дрэў адзначылі Дзень народнага адзінства ў Мінскай вобласці.

У Вілейцы 17 верасня прайшоў канцэрт-акцыя «Час выбраў нас!», у рамках якога адбыліся выступленні кіраўнікоў раённых грамадскіх аб'яднанняў. Працавалі іх, а таксама ўстаноў культуры і адукацыі інтэрактыўныя зоны, выставы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Дзень народнага адзінства ў Дзяржынскім раёне пачаўся з аўтапрабегу з удзелам каля 100 аўтамабіляў па маршруце праз найвышэйшы пункт Беларусі — гару Дзяржынскую, дзе прайшоў тэатралізаваны мітынг «Там Беларусі вышэй усёй зямля Дзяржыншчыны маёй».

У Капыльскім раёне да святочнай даты прымеркавалі рэспубліканскі лёгкаатлетычны забег Kopyl Race «За адзіную Беларусь». У ім узялі ўдзел каля 700 чалавек — сямейныя каманды, навучэнцы ўстаноў адукацыі, аматары экстрэмальных відаў спорту. Аўтапрабегам «Маршрутамі памяці, маршрутамі адзінства», а таксама канцэртам «Квітней пад небам, Беларусь!» адзначылі свята ў Крупскім раёне.

У Лагойску ўшанавалі жыхароў раёна з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй.

Жыхароў Любаншчыны парадавала абласное свята мастацтваў «Палескія сустрэчы» з правядзенням майстар-класаў салістамі аркестра заслужанага калектыву «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі імя М. Я. Фінберга». Таксама тут прайшоў патрыятычны марафон «Дзень народнага адзінства як сімвал гістарычнай праўды» з дыялогавай пляцоўкай «Пра час, пра Радзіму, пра нас» з удзелам лектараў Любанскай раённай арганізацыйнай структуры РДГА «Веды», членамі маладзёжнага парламента пры Любанскім раённым Савеце дэпутатаў.

Жыхароў горада Мядзела сабрала ў летнім амфітэатры святочная праграма «У адзінстве пакаленняў — сіла Беларусі» з удзелам калектываў мастацкай самадзейнасці раёна. На плошчы Шаранговіча працавалі інтэрактыўныя пляцоўкі, фотазоны, аб'екты харчавання, выставы вырабаў рамеснікаў.

У Нясвіжы адбылася канцэртная праграма «Вялікі народ, калі народ адзіны»: выступілі таленавітыя вучні сярэдніх школ. Актывісты горада і раёна таксама ўдзельнічалі ў велапрабегу па месцах баявой славы. Урачысты вечар «Радзіма — тое, што нас яднае!» з выступленнем лідараў палітычных партый, грамадскіх арганізацый і канцэртнай праграмай сабраў жыхароў Салігорска ў Палацы культуры. Маладзёжны флэшмоб у рамках акцыі «Адзінства і братэрства — найлепшае багацце» прайшоў у Старых Дарогах. Затым актывістаў раёна і жыхароў запрасілі на ўрачыстае мерапрыемства «Мы сілай адзінай дужыя».

Экалагічную акцыю па пасадцы яблыневага саду з удзелам прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса, грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, жыхароў у мікрараёне Паўночны правялі ў Стоўбцах.

У Жодзіне каля манумента ў гонар савецкай маці-патрыёткі А. Ф. Купрыянавай прайшоў урачысты мітынг «Будучыня краіны ў адзінстве!». Адсюль быў дадзены старт вела-, аўтапрабегам, а таксама лёгкаатлетычнаму забегу. У рамках мерапрыемства адбылося ўручэнне білетаў і значкоў новым членам БРСМ. Прадоўжыў святочную праграму гарадскі фестываль беларускай традыцыі і культуры «Па Бульбе» ў гарадскім Парку культуры і адпачынку.

Завершыцца цыкл мерапрыемстваў абласным святам 21 верасня ў Маладзечне. Запланавана работа тэматычных пляцовак, гандлёвых радоў, выстаў, інтэрактыўных зон, шырокай канцэртнай праграмы з удзелам зорак эстрады.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.

АГУЛЬНАЯ АДДАНАСЦЬ РАДЗІМЕ

Дзень народнага адзінства азначае нашу агульную адданасць Беларусі, а любоў і беражлівыя адносіны да Радзімы, клопат аб ёй з'яўляюцца апорнымі канструкцыямі беларускай дзяржаўнасці, нашым генетычным і культурным кодам. Аб гэтым на святочным мерапрыемстве ў Канцэртнай зале «Віцебск» сказаў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.

«17 верасня — найважнейшая дата ў календары дзяржаўных свят. Па значнасці яна стаіць у адным шэрагу з Днём Перамогі і Днём Незалежнасці», — сказаў кіраўнік рэгіёна. Ён нагадаў гісторыю свята і дадаў, што сёння наша незалежная краіна мае свой шлях развіцця. «Маштабныя пераўтварэнні адбываюцца і ў Віцебскай вобласці. Мы асвойваем новыя віды прадукцыі, пашыраем яе асартымент, мадэрнізуем вытворчасці, укараняем новыя тэхналагічныя рашэнні. У мэтах павышэння турыстычнай прывабнасці раёнаў вобласці пачаты праекты па рэканструкцыі палацава-паркавых ансамбляў і выкарыстанні свабодных інвестыцыйных плошчаў у Пастаўскім, Расонскім і Ушацкім раёнах. Вызначана канцэпцыя павышэння інвестыцыйнай прывабнасці і стварэння ўмоў устойлівага развіцця кожнага з раёнаў вобласці», — падкрэсліў старшыня аблвыканкама.

За намаганні і ўклад у развіццё вобласці Аляксандр Субоцін у святочны дзень уручыў больш як 110 узнагарод прадстаўнікам розных прафесій, а таксама арганізацый і прадпрыемстваў з абласнога цэнтра і з усяго паўночнага рэгіёна. Гэта работнікі будаўнічай галіны, сфер гандлю і грамадскага харчавання, культуры, прамысловасці, транспарту, ЖКГ, адукацыі, аховы здароўя, турызму, масмедыя.

Фота БелТА

Ключы ў руках кіроўцы Бешанковіцкага філіяла Мікалая ШАРСТНЁВА.

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Сяргей ЛЯЎКОВІЧ, які ўзяў удзел у мерапрыемстве, таксама падкрэсліў значнасць маладога свята. «Дзякуючы кансалідацыі вакол нашага Прэзідэнта мы жывем у моцнай, квітнеючай і незалежнай краіне. Дзякуючы нашаму адзінству мы можам быць гаспадарамі на нашай зямлі», — сказаў Сяргей Ляўковіч.

Для ўдзельнікаў святочнага мерапрыемства творчыя калектывы і выканаўцы горада прапанавалі вакальныя і харэаграфічныя нумары.

Да Дня народнага адзінства ў Віцебскім дзяржаўным вучылішчы алімпійскага рэзерву ўрачыста адкрылі абноўленую лыжароллерную трасу з біятлонным стрэльбішчам, стартавай пляцоўкай і штрафным кругам.

У гэты ж дзень у Віцебску вадзіцелям дзесяці новых аўтакрам уручылі ключы. Аўтакрамы будуць абслугоўваць Бешанковіцкі, Верхнядзвінскі, Докшыцкі, Лепельскі, Пастаўскі, Сенненскі, Ушацкі філіялы Віцебскага аблспажыўтаварыства. Грузавікі МАЗ абсталяваныя халадзільнікамі і ўсім неабходным, маюць вялікую ёмістасць.

Разам — на велатрэку, у храме, на сцэне

Шматлікія дыялогавыя пляцоўкі, круглыя сталы, мітынгі, фестывалі і адзін з самых маштабных велапрабегаў... Гэтыя і іншыя мерапрыемствы прайшлі на Гомельшчыне ў Дзень народнага адзінства.

З нагоды свята жыхары ўсіх раёнаў вобласці адначасова выйшлі на старт велапрабегу «У адзінстве сіла!». Калоны велааматараў праехалі па галоўных вуліцах населеных пунктаў рэгіёна. У Гомелі гэтую патрыятычную акцыю падтрымалі больш чым пяць тысяч гараджан. Стартаваў велапрабег ад цэнтральнай плошчы абласнога цэнтра імя Леніна. Разам у калоне маршрут пераадолелі прадстаўнікі ўлад вобласці і горада, працоўных калектываў, члены грамадскіх аб'яднанняў, педагогі, школьнікі, моладзь.

Як адзначыў **начальнік аддзела спорту і турызму Гомельскага гарвыканкама Ігар ПАЛУЯН,** збірацца ў Дзень народнага адзінства спартыўнай дружнай камандай для жыхароў Гомеля — выдатная традыцыя.

— І хоць свята гэтае маладое, колькасць удзельнікаў тэматычнага велапрабегу з кожным годам расце, — канстатаваў Ігар Палуян.

— Ужо традыцыйна ў Дзень народнага адзінства велапрабег аб'ядноўвае тысячы прыхільнікаў спорту. І кожны, хто рухаецца ў дружнай калоне па вуліцах горада, пераадольваючы дыстанцыю, адчувае ўзаемападтрымку, і згуртаванне. І, вядома, разумее, што разам мы дасягнем многага, — падкрэсліў **намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама Аляксандр АСТАШОНАК.**

У раёнах Гомельшчыны з нагоды свята прайшлі ўрачыстыя мітынгі. Для школьнікаў арганізаваны адзіны ўрок, прысвечаны 85-годдзю ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР.

У Петрыкаўскім раёне каля чыгуначнай станцыі аграгарадка Пціч адбылося перапахаванне астанкаў воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Жыхары Мазыршчыны і вернікі Тураўскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы змаглі далучыцца да падзячнага малебну аб уз'яднанні беларускага народа ў 1939 годзе. Ён быў адслужаны ў Свята-Міхайлаўскім кафедральным саборы ў Мазыры. Між тым ва ўсіх храмах і манастырах Гомельскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы ў Дзень народнага адзінства была ўзнесена малітва аб Беларусі.

Патрыятычную акцыю «МЫ — РАЗАМ» падтрымалі актывісты Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў. Прафсаюзны актыў вобласці, старшыні галіновых прафсаюзаў, студэнты з нагоды свята заклалі алею каля Гомельскага філіяла «Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО».

Напярэдадні Дня народнага адзінства ў падарунак для жыхароў мікрараёна Хутар Навабеліцкага раёна Гомеля адкрылі першы ў рэгіёне дзіцячы садок са скаладромам. Ва ўстанове дашкольнай адукацыі на 270 месцаў размясціліся таксама танцавальная зала, студыя выяўленчага мастацтва і басейн. Гомельскі аблвыканкам і гарвыканкам перадалі ўстанове дашкольнай адукацыі грашовыя сертыфікаты на 100 і 150 тысяч беларускіх рублёў.

У Лельчыцах да свята прымеркавалі адкрыццё пасля капітальнага рамонту будынка Цэнтра па забеспячэнні бюджэтных арганізацый. Доўгачаканым падарункам для жыхароў Кармянскага раёна стала адкрыццё ў гарадскім пасёлку Карма абноўленай аўтастанцыі.

Напярэдадні Дня народнага адзінства ў Гомелі таксама прайшоў урачысты сход і святочная праграма для жыхароў рэгіёна. Словы вiншавання адрасаваў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.** Кіраўнік рэгіёна падкрэсліў, што сёлета да Дня народнага адзінства на Гомельшчыне праводзяцца шматлікія мерапрыемствы, якія сцвярджаюць важнасць гістарычнай падзеі і Дня народнага адзінства.

— Заўсёды памятайце: мы з вамі жывём у самым цудоўным кутку планеты, імя якому — Беларусь, — заклікаў Іван Крупко.

Наталля КАПРЫЛЕНКА. Фота «Петрыкаўскія навіны».

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
18 верасня 2024 г. № 35 (768)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

СІТУАЦЫІ, ЯКІЯ ТРЭБА РЭГУЛЯВАЦЬ ЗАКАНАДАЎЧА

Фота БелТА.

Падрабязнасці прыёму грамадзян Наталляй КАЧАНАВАЙ у Іўі Гродзенскай вобласці

У Савет Рэспублікі паступае шмат зваротаў ад жыхароў краіны. Так, за восем месяцаў гэтага года іх парадку пяці тысяч. Ужо стала добрай традыцыяй штомесячна праводзіць адзіны дзень прыёму грамадзян, калі сенатары працуюць ва ўсіх раёнах той ці іншай вобласці. Такая практыка дазваляе прааналізаваць пытанні, выявіць праблемы, выпрацаваць комплексны падыход да іх вырашэння. Гэтым разам сенатары працавалі ў Гродзенскай вобласці.



Узаконіць права на сядзібу

У ліку першых на асабісты прыём да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай, прыйшла 72-гадовая жыхарка вёскі Ганчары Іўеўскага раёна Марыя Канстанцінаўна. Жанчына хоча выкупіць жылы дом, які знаходзіцца ва ўласнасці гродзенскага прадпрыемства.

Яна патлумачыла, што яе муж працаваў у гаспадарцы, якая выдзеліла жыллё, але дзесяць гадоў таму памёр. У гэты час вялася рэарганізацыя сельгаспрадпрыемства і сям'я не паспела аформіць дакументы. Такім чынам, працэс прыватызацыі быў прыпынены і дом застаўся ва ўласнасці гаспадаркі. Жанчына цяпер пражывае адна, яна згодна заплаціць ацэначны кошт дома, які за 25 гадоў пражывання даглядала і добраўпарадкоўвала — зрабіла склеп, пасадзіла сад. Пакуль новы ўласнік адмаўляе жанчыне ў прыватызацыі жылога дома, які ў свой час будаваўся за бюджэтныя сродкі.

Як аказалася, такая жыццёвая сітуацыя не адзінкавая. Наталля Качанава зазначыла, што падобныя пытанні нядаўна абмяркоўваліся на экспертным савеце з кіраўніцтвам Дзяржкаммаёмасці. Чалавек сабраў пакет дакументаў, але не паспеў давесці справу да канца, бо раптоўна памёр. Такія сітуацыі таксама трэба заканадаўча ўрэгуляваць, бо тэма неаднаразова ўздымалася як грамадзянамі, так і парламентарыямі. Таксама яна прыгадала, што цяпер ёсць магчымасць у прадпрыемстваў будаваць больш жылля для сваіх работнікаў і прымаць рашэнні з яго далейшай прыватызацыяй.

— Мы на сваім узроўні разбяромся, што можна па законе зрабіць. Усё вывучым сумесна з Дзяржкаммаёмасцю. Калі патрэбна, заканадаўча гэта ўрэгулюем, бо такія пытанні ў людзей узнікаюць, — зазначыла падчас прыёму Наталля Качанава.

З першай заяўніцай пераклікаецца і зварот Валянціны Віктараўны з Іўеўскага раёна. Толькі тут справа датычыць самавольных пабудоў, якія цяпер трэба ўзаконіць. Жанчына спасылаецца на ўказ Прэзідэнта па зямельнай амністыі. Пабудовы ўзведзены на новым участку для патрэб фермерскай гаспадаркі, дзе займаюцца вырошчваннем бульбы і збожжавых культур.

Сям'я сабрала пакет дакументаў, атрымала рашэнні экспертных камісій. Справа цягнецца паўтара года. Нядаўна стала вядома, што трэба пачынаць новы збор дакументаў. Жанчына перажывае, ці не зацягнецца гэты працэс яшчэ на нейкі нявызначаны тэрмін.

Падчас прыёму сітуацыя атрымала канкрэтны вынік. Па словах кіраўніка Іўеўскага райвыканкама, участак з самавольнымі гаспадарчымі пабудовамі можа быць афармлены як дадатковы да атрыманага раней фермерскага надзелу. Рашэнне аб гэтым будзе прымацца аблвыканкамам па звароце раённай улады.

Зямельны парадокс

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, з падобнай з'явай прыйшлося сутыкнуцца ўпершыню. Справа і сапраўды больш нагадвае сюжэт фельетона.

А здарылася яна ў аграгарадку Адэльск Гродзенскага раёна, адкуль прыехала на прыём мясцовая жыхарка Тэрэза Іосіфаўна. Яе гісторыя пачалася 10 гадоў таму, калі побач з сядзібай пасяліўся неўтаймаваны сусед. Па словах заяўніцы, яго ведалі ў раёне як скаржніка. Каб пазбегнуць недарэчнасцяў, сям'я ўстанавіла паміж участкамі капітальную агароджу. Але сусед заявіў, што парушылі яго мяжу: і калодзеж суседскі на яго мяжы стаіць, і агароджа не адпавядае нарматыўным актам.

(Заканчэнне на 9-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Умацаванне саюзніцкіх адносін

Пачала работу другая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу восьмага склікання

Сенатары ратыфікавалі два найважнейшыя пагадненні паміж урадамі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Адно з іх датычыцца распрацоўкі і арганізацыі серыйнай вытворчасці двухрухавіковага лёгкага шматцэлявога самалёта «Асвей», другое — парадку прызнання электроннага подпісу (электроннага лічбавага подпісу) у электронным дакументе пры трансгранічным электронным узаемадзеянні.

Як адзначыў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Дзмітрый ЖУК,** апошні дакумент спрашчае ўдзел беларускіх прадпрыемстваў у закупках, іншых гандлёвых аперацыях на тэрыторыі Расіі. «У рамках гэтага пагаднення Расійская Федэрацыя бязвыплатна перадасць нам, беларускаму боку, неабходнае абсталяванне, праграмныя комплексы для ўкаранення гэтай тэхналогіі, — канкрэтызаваў ён. — Папяровы дакументаабарот — гэта ўжо ўчарашні дзень. Мы жывём у XXI стагоддзі, і тэхналогія электроннага лічбавага подпісу ўнутры краіны ўжо працуе. Гэта будзе вельмі зручна для прадпрыемстваў, якія ажыццяўляюць знешнеэканамічную дзейнасць у рамках Саюзнай дзяржавы».

З іншага боку, па словах сенатара, лічбавыя тэхналогіі робяць усе працэдуры празрыстымі. «Гэта аблегчыць падатковы кантроль за гэтым і кантроль за легальным абаротам тавараў», — удакладніў Дзмітрый Жук.

Мэтай Пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб распрацоўцы і арганізацыі серыйнай вытворчасці двухрухавіковага лёгкага мнагамэтавага самалёта «Асвей», падпісанага 15 красавіка 2024 года ў Маскве, з'яўляецца вызначэнне ўмоў і парадку рэалізацыі сумеснага праекта ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі і тэхналагічнага суверэнітэту дзвюх краін. Узаемадзеянне па пытаннях сертыфікацыі і лётнай прыдатнасці будзе ажыццяўляцца праз упаўнаважаныя органы. Ад беларускага боку — Дэпартаментам па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый, ад расійскага — Федэральным агенцтвам паветранага транспарту Міністэрства транспарту.

Кажучы аб ратыфікацыі Пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб распрацоўцы і арганізацыі серыйнай вытворчасці двухрухавіковага лёгкага мнагамэтавага самалёта «Асвей», **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей АЛЕЙНІК** адзначыў, што пагадненне будзе садзейнічаць умацаванню беларуска-расійскага прамыслова-тэхналагічнага супрацоўніцтва, а таксама рэалізацыі на базе 558-га авіяцыйнага рамонтнага завода інвестыцыйнага праекта па стварэнні вытворчасці самалётаў, дэталяў, зборачных адзінак з узроўнем стапрацэнтнай лакалізацыі ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Па словах сенатара, першыя дослednыя ўзоры самалётаў «Асвей» павінны быць выраблены ў 2026—2027 гадах. «А з 2030 года на 558-м заводзе плануецца штогод вырабляць да 20 адзінак авіяцыйнай тэхнікі, — адзначыў Сяргей Алейнік. — Рэалізацыя пагаднення забяспечыць доступ беларускага боку да тэхналогій расійскіх вытворцаў авіяцыйнай тэхнікі, стварэнне ў Беларусі авіябудаўнічага прадпрыемства з вытворчасцю пятага тэхналагічнага ўкладу, рост занятасці насельніцтва, павышэнне экспартнага патэнцыялу прадпрыемстваў нашай краіны шляхам выхаду на новыя рынкі, у тым ліку афрыканскія, навучанне беларускага вытворча-тэхналагічнага персаналу і напрацоўку адпаведных кампетэнцый».

Вераніка КАНЮТА.

«НЕЛЬГА БЫЦЬ РАЎНАДУШНЫМ У АДНОСІНАХ

Выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі пад кіраўніцтвам Наталлі Качанавай прайшло ў Лідзе

Разглядалася эфектыўнасць работы са зваротамі органаў улады Гродзенскай вобласці. У рабоце пашыранага пасяджэння ўзялі ўдзел парадку 700 удзельнікаў, у тым ліку ў анлайн-рэжыме. Папярэдні такога роду фармат сустрэчы парламентарыяў і органаў улады адбыўся напрыканцы 2021 года. Цяпер тэма зваротаў мае асаблівае значэнне. Ва ўмовах геапалітычнага супрацьстаяння дэпутаты і органы ўлады павінны быць у пастаянным кантакце з людзьмі, каб ведаць тыя праблемы і пытанні, якія ў іх узнікаюць.

Пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі стала лагічным завяршэннем адзінага дня прыёму грамадзян і юрыдычных асоб у Гродзенскай вобласці сенатарамі на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай. Яна зазначыла, што тэма зваротаў заўсёды актуальная для нашай краіны, бо арыентаваная на інтарэсы народа. І хаця формы работы з грамадзянамі пастаянна ўдасканальваюцца, у тым ліку задзейнічаны інтэрнэт-платформы, але нішто не заменіць жывога кантакту з людзьмі. Для канструктыўнага дыялогу важна слухаць і чуць адзін аднаго, каб прынятыя рашэнні садзейнічалі дабрабыту чалавека і дзяржавы.

«Работа са зваротамі грамадзян — асноўны кірунак у дзейнасці дэпутатаў усіх узроўняў. Работа са зваротамі грамадзян, прыёмы па асабістых пытаннях — гэта тое, што ляжыць у аснове нашай дзейнасці», — сказала Наталля Качанава.

Парламенцкі дэсант працаваў ва ўсіх раёнах Гродзеншчыны і абласнога цэнтра. Падчас пасяджэння быў зроблены аналіз сітуацыі ў рэгіёне.

Як зазначыла Наталля Качанава, у Гродзенскай вобласці работа са зваротамі грамадзян выбудавана эфектыўна. Адсюль у Савет Рэспублікі паступіла менш зваротаў, чым з іншых рэгіёнаў краіны. Тут усё дастаткова нядрэнна. Але разам з тым іх колькасць за восем месяцаў павялічылася.

Статыстыку агучыў начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян Савета Рэспублікі Максім Шэко. Ён паведаміў, што за восем месяцаў у Савет Рэспублікі ад жыхароў Гродзенскай вобласці паступіла 455 зваротаў, што на 76 працэнтаў больш, чым летась. Па краіне — 4800 зваротаў, што таксама больш, чым у мінулым годзе. Рост назіраецца ў Брэсцкай, Гомельскай, Віцебскай, Магілёўскай абласцях, а вось па Мінскім раёне і сталіцы гэты паказчык знізіўся. Між тым удзельная вага зваротаў Гродзенскай вобласці застаецца самай мінімальнай на працягу названага перыяду — ад 6 да 9 працэнтаў. З рэгіёна часцей звяртаюцца жыхары абласнога цэнтра. А вось з Бераставіцкага раёна да сенатараў не паступіла ніводнага звароту.

Аналіз паказвае, што ў 2024 годзе гродзенцаў, як і большасць заяўнікаў, хвалюе стан ЖКГ і добраўпарадкаванне населеных пунктаў, ахова здароўя, землекарыстанне, працоўная занятасць, пытанні пенсіённага забеспячэння. Грамадзяне звярталіся ў асноўным індывідуальна, але нямала і калектыўных зваротаў. Яны разглядаліся дэпутатамі асабліва шчыльна. Як правіла, жыльцы дамоў наракаюць на адсутнасць рамонту і адцягванне тэрміну работ.

Некаторыя грамадзяне звяртаюцца да старшыні Савета Рэспублікі як да апошняй інстанцыі. У той жа час больш за 90 працэнтаў зваротаў — гэта праблемы мясцовага характару і павінны вырашацца на мясцовым узроўні. Напрыклад, з адной з вуліц Гродна грамадзяне звярнуліся з просьбай аб ліквідацыі стыхійнай паркоўкі. Пытанне было накіравана ў гарвыканкам, дзе быў прапанаваны варыянт долевога будаўніцтва. Сітуацыя з частковым фінансаваннем вырашылася ў Смаргоні, дзе грамадзяне робяць тратуар, а дзяржава асфальтуе дарогу.

Ёсць і прыклады, калі людзі звяртаюцца ў Савет Рэспублікі з такімі пытаннямі, як устаноўка ліхтара, спілоўванне аварыйнага дрэва альбо ўладкаванне мосціка праз ручай. Заяўнікі матывуюць свой зварот тым, што старшыня сельсавета не можа іх вырашыць. Між тым на ўсе пытанні адразу адрэагавалі ў аблвыканкаме. Дарэчы, у абласны выканаўчы камітэт з пачатку года паступіла крыху больш за тысячу зваротаў. Паступова іх колькасць знікаецца. Гэта абумоўлена, у тым ліку і шырокай інфармацыйнай работай на інтэрнэт-пляцоўках, прэс-канферэнцыях, падчас якіх жыхары могуць задаць свае пытанні і атрымаць адказ непасрэдна ад кіраўніка рэгіёна.

Асноўныя пытанні, з якімі жыхары звяртаюцца да абласных улад, датычаць рамонту і эксплуатацыі жылля, добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, пракладкі інжынерных сетак. Скардзяцца і на няякасную работу гарадскога і пасажырскага транспарту. У значнай ступені нараканні выкліканы недахопам рухомага саставу. Напрыклад, у Гродне з існуючых 900 адзінак аўтобусаў і тралейбусаў трэба замяніць 70 працэнтаў. Работа ў гэтым кірунку вядзецца. Сёлета ўрадам прынята рашэнне накіраваць сродкі на аднаўленне 10 працэнтаў гарадскога транспарту краіны, такая ж норма застанецца на наступны год.

Дарэчы, транспартная праблема ўзята пад асабісты кантроль Старшынёй Савета Рэспублікі. «Многае зроблена, і ўлады абавязаны ўтрымаць гэта на ўзроўні, развіваць надалей. Разам з тым не варта і замоўчваць праблемы, якія ёсць. Людзі прыходзяць з актуальнымі для іх пытаннямі, і да гэтага трэба ставіцца ўважліва. Нельга быць раўнадушнымі ў адносінах да грамадзян, займацца валакітай, адпіскамі і падманваць людзей. Гэта падрывае давер да ўлады. Таму лепш сказаць праўду, назваць канкрэтныя тэрміны выканання, няхай яны будуць не такія хуткія, але рэальныя. Тады і аўтарытэт мясцовых органаў улады будзе толькі расці», — акрэсліла сваю пазіцыю падчас пасяджэння Наталля Качанава.

Кіраўнік Лідскага райвыканкама Сяргей Ложачнік падзяліўся практыкай вырашэння жыллёва-камунальных праблем. Як вядома, менавіта гэтыя пытанні складаюць пераважную большасць зваротаў, у тым ліку і на Лідчыне. Таму гэта тэма адна з прыярытэтных у рабоце раённай улады. Тут не толькі ідуць па слядах зваротаў, але і працуюць на іх апярэджанне. Так, за два гады выканана значная работа па водазабеспячэнні: адбылася замена звыш 10 кіламетраў цеплавых сетак, прывезены ў парадак прыдамавыя тэрыторыі, будуюцца станцыі абязжалезвання вады і тры ачышчальныя збудаванні, актыўна аднаўляецца жыллёвы фонд. За паўтара года адрамантавана звыш 24 км дарожнага палатна. Усё гэта зніжае колькасць зваротаў у дадзенай сферы.

«Без развіцця вёскі або Як замацаваць

На мінулым тыдні ў аграгарадку Азярцо Мінскага раёна адбылося пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ. На ім аўтарытэтныя спікеры ўзнялі важную і актуальную тэму — замацаванне кадраў і маладых спецыялістаў у сельскай мясцовасці. Карэспандэнт «Звязды» наведаў пасяджэнне і разам з прадстаўнікамі міністэрстваў і ведамстваў пастараўся разабрацца, як усё ж такі замацаваць чалавека на вёсцы.

«...Людзі павінны жыць годна і атрымліваць годную заработную плату»

Штогод каля шасці тысяч маладых людзей прыходзяць працаваць на прадпрыемствы і ў арганізацыі сельскай мясцовасці. Але застаюцца толькі 50 працэнтаў спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Сярод педагогаў гэты паказчык складае 64 працэнты. Сама замацаванасць кадраў пакідае жадаць лепшага. Па словах Наталлі Качанавай, разгляд гэтых пытанняў з сельскай мясцовасці пачаты невыпадкова: «Вы ведаеце, як важна для нашай краіны менавіта сельская мясцовасць. Прэзідэнт сказаў: без развіцця вёскі краіны не будзе. Роўна як не будзе любой іншай галіны, калі не будзе кадраў. Калі ёсць кадры, тады можна працаваць. А калі яшчэ гэтыя кадры працуюць эфектыўна, то будзе і цудоўны вынік. Давайце ўсе разам яшчэ раз падумаем, што трэба сёння зрабіць для таго, каб замацаванне кадраў было больш эфектыўным».

Па словах спікера Савета Рэспублікі, для маладых спецыялістаў павінны быць створаны ўсе ўмовы, каб яны заставаліся ў тым рэгіёне, куды былі размеркаваны: «Дрэнна, калі адпрацаваў два гады і з'ехаў. Трэба, каб малады чалавек прыехаў у аграгарадок, палюбіў яго, застаўся, стварыў сям'ю, выхоўваў дзяцей. Усе ўмовы для гэтага ёсць».

Наталля Качанава нагадала і пра задачу ад Прэзідэнта аб мацных рэгіёнах: «Для нас гэта вельмі важна. На вёсцы людзі павінны жыць годна і атрымліваць годную заработную плату. Дзе б чалавек ні працаваў: трактарыстам, кіроўцам, даяркай, работнікам гандлю або сферы паслуг».

На думку Старшыні Савета Рэспублікі, для таго, каб людзі працавалі на вёсцы, трэба больш паказваць іх у СМІ: «Гэта дарагога варта, калі паварочваюцца тварам да тых людзей, якія ствараюць для нас даброты. Як сказаў Прэзідэнт, без развіцця вёскі не будзе краіны. Гэта праўда. Мы сёння столькі зарабляем на экспарце прадуктаў харчавання, кормім свой народ. Таму трэба больш такіх перадач, дзе паказваюць людзей, якія працуюць на вёсцы. Мы павінны паказваць гэтых людзей. І казаць пра тыя перавагі, якія ёсць для работнікаў у сельскай мясцовасці».

«Не проста слухаць, але і чуць»

Наталля Іванаўна падкрэсліла і значнасць работы з людзьмі. Паводле слоў спікера, работа з грамадзянамі — адзін з ключавых кірункаў дзейнасці Савета Рэспублікі: «Можна сказаць, што наша асноўная задача — гэта работа над законапраектамі. Але законапраекты і законы ідуць ад жыцця, ад зямлі. І, каб прыняць правільнае рашэнне, мы павінны ведаць тое, што адбываецца ў асобна ўзятым горадзе, раёне, вёсцы. Як жывуць людзі, якія праблемы іх хвалююць, і, вядома, мы павінны вельмі актыўна працаваць сёння з людзьмі. Як кажа Прэзідэнт, мы павінны не проста слухаць людзей, але і чуць. А самае галоўнае — вырашаць гэтыя пытанні, і перш за ўсё пытанні, якія датычацца занятасці і заработнай платы. Трэба стварыць умовы для працы, даць годны заробак, і тады, вядома, чалавек будзе вызначаць сваё месцажыхарства там, дзе ёсць у яго праца і добры заробак», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Яна падкрэсліла, што з людзьмі трэба працаваць: «І гэта не толькі веданне тых праблем, якія ёсць у людзей, а яшчэ і разуменне працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве ў цэлым. Гэта яшчэ і даступнасць любога органа дзяржаўнай улады для таго, каб прыехаў кіраўнік або намеснік, пабываў у рэгіёне, убачыў, што адбываецца, як працуюць яго структуры ў гэтым раёне. І для нас, членаў Савета Рэспублікі, вядома, гэтая работа асноватворная, таму што мы яшчэ і орган тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Члены Савета Рэспублікі працуюць ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны. Гэта настаўнікі, урачы, работнікі сельскай гаспадаркі. І калі мы выязджаем і праводзім прыёмы па асабістых пытаннях, сустрэчы, гэта добрае падсілкоўванне для таго, каб працягваць гэту працу далей», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу: «Але самае галоўнае — мы заўсёды павінны данесці тую праўду, якую мы ведаем пра тое, што адбываецца не толькі ў нас у краіне, але і на знешнім контуры ў адносінах да нашай краіны. Бо мы разумеем, як сёння няпроста складваецца сітуацыя ў свеце. І вось тут мы павінны людзям расказаць праўду. А калі людзі чуюць праўду, вядома, яны разумеюць: што ўсё, што адбываецца, — гэта аб'ектыўна. Для гэтага мы, вядома, сустракаемся з людзьмі і стараемся рабіць усё для таго, каб нашы прыёмы па асабістых пытаннях, нашы сустрэчы прыносілі вынік і былі эфектыўныя, прыносілі карысць для нашага народа і нашай краіны».

Плюс адпаведная сацыяльная інфраструктура

Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН адзначыў, што на пачатак года ў сельскай мясцовасці пражывала каля 21,4 працэнта грамадзян краіны. Прычым у Мінскай вобласці гэты паказчык самы высокі — каля 45 працэнтаў! У першую чаргу дзякуючы прысталічнаму рэгіёну. У большасці ж рэгіёнаў колькасць людзей, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, зніжаецца.

«Арганізацыі ўсіх галін у асноўным забяспечаны кадрамі для паўнавартаснай працы. Аднак праблемы існуюць, — акцэнтаваў Аляксандр Турчын. — У параўнанні з мінулым годам амаль на траціну павялічылася колькасць вакансій: сёння гэты паказчык складае 24,7 тысячы. Амаль 70 працэнтаў з іх — па рабочых прафесіях. У Мінскай вобласці, як і ў іншых рэгіёнах, не хапае ветэрынарных урачоў, заатэхнікаў, будаўнікоў, санітарак, урачоў, медсясцёр».

Прычыны гэтаму розныя: недабор у навучальных установах, не ў поўнай меры выкарыстанне магчымасцяў мэтавай падрыхтоўкі, нізкі прэстыж асобных прафесій, невялікая зарплата, цяжкія ўмовы працы. «Як казаў Прэзідэнт, павінны быць работа і зарплата. Узяць той жа «Агракамбінат «Ждановічы». Тут створаны годныя ўмовы працы, моладзь атрымлівае добры заробак. Што для гэтага трэба зрабіць? Вядома, у першую чаргу важна эфектыўная работа дзеючых прадпрыемстваў. Плюс іх пастаянная мадэрнізацыя», — адзначыў губернатар.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна нагадаў аб вядомай ініцыятыве «Адзін раён — адзін праект»: «Каб прадпрыемствы больш актыўна ўключаліся ў гэты працэс, трэба паглядзець умовы крэдытавання праектаў. Бо калі прадпрыемства ўваходзіць у дадзеную ініцыятыву, Банк развіцця вылучае фінансаванне пад 8 працэнтаў гадавых. Тады як камерцыйны крэдыт банкаў — 9,5—12 працэнтаў. Такая невялікая розніца не зусім стымулюе прадпрыемствы для таго, каб больш эфектыўна займацца мадэрнізацыяй».

«Эфектыўная работа сельгаспрадпрыемстваў мае ключавое значэнне для замацоўвальнасці кадраў у сельскай мясцовасці, — адзначыў Аляксандр Турчын. — Цэлы шэраг даручэнняў кіраўніка дзяржавы накіраваны на стварэнне нармальных умоў для працы грамадзян. Тыя рашэнні, якія цяпер Прэзідэнт падтрымлівае ў развіцці жывёлагадоўлі, птушкагадоўлі, — адна з задач для сельскай гаспадаркі ў найбліжэйшыя пяць гадоў. Цэлы шэраг даручэнняў дадзены: калі мы гэтыя даручэнні рэалізуем, то ў большасці нашых сельскагаспадарчых раёнаў умовы працы і ўзровень зарплаты будзе той, які неабходны».

ДА ГРАМАДЗЯН»

А вось для сельскіх тэрыторый найбольш актуальнай тэмай з'яўляецца добраўпарадкаванне. Па гэтым шляху ідуць і ў Воранаўскім раёне. Па словах старшыні райсавета Алены Ганевіч, звароты напрамую звязаны з якасцю жыцця. Таму тут імкнуцца наводзіць парадак: закладваюць паркі, ліквідуюць трухлявыя дамы, на месцы даўгабудаў ствараюць спартыўныя, дзіцячыя і нават танцавальныя пляцоўкі. Рамантуюцца сацыяльныя аб'екты, школы, наводзіцца парадак на тэрыторыях, будуюцца арэндныя кватэры, каб стварыць умовы маладым спецыялістам. Дарэчы, замацаванасць кадраў у раёне складае 70 працэнтаў. Улады заняліся вырашэннем праблемы пітной вады, якая звязана са станам водаправодных сетак. Людзі бачаць, што іх праблемы вырашаюцца. Усё гэта садзейнічае зніжэнню сацыяльнай напружанасці, адпаведна зніжаецца і колькасць зваротаў, у тым ліку і ў самыя нізавыя структуры — сельскія Саветы.

На словах старшыні Дзярэчынскага сельскага Савета Зэльвенскага раёна Аляксандра Белякалы, работу з насельніцтвам трэба весці пастаянна і ў розных фарматах. Таму тут практыкуюць выязныя прыёмы грамадзян, сельскія сходы, прамыя лініі. Усе разам — месцічы і ўлада — імкнуцца палепшыць жыццё ў сваіх населеных пунктах. На тэрыторыі сельскага Савета ўвасоблены два праекты грамадзянскіх ініцыятыў з удзелам мясцовых жыхароў.

У ходзе пасяджэння Наталля Качанава падкрэсліла, што на пытанне ўзаемадзеяння з насельніцтвам акцэнт робіцца заўсёды. Аб гэтым ішла гаворка і на нядаўняй нарадзе ў Прэзідэнта па ўнутрыпалітычных пытаннях развіцця дзяржавы. У прыватнасці, гаварылі аб тым, што дэпутаты любога ўзроўню павінны вельмі эфектыўна працаваць з людзьмі. «Прайшлі выбары, і ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, як і ва ўсе іншыя ўзроўні, прыйшлі працаваць новыя людзі, якія павінны разумець важнасць гэтай работы і актуальнасць на сучасным этапе», — зазначыла старшыня Савета Рэспублікі.

Спікер паведаміла, што ў найбліжэйшы час асаблівая ўвага будзе ўдзелена пытанням развіцця аграгарадкоў і малых вёсак. «Прайшло пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні, дзе разглядалі пытанні замацавання кадраў у вёсцы. Мы створым рабочую групу, у якую ўвойдуць спецыялісты розных міністэрстваў і ведамстваў. Будзем выязджаць у аддаленыя рэгіёны нашай краіны, перш за ўсё гэта датычыцца сельскай мясцовасці: вёскі, аграгарадкі. І будзем глядзець, наколькі там эфектыўна вырашаюцца пытанні кадравага забеспячэння, будаўніцтва і выдзялення жылля, забеспячэння перш за ўсё работай, выплат заработнай платы. Важна, каб людзі там таксама жылі камфортна. Такі падыход будзе ў далейшым для нас той важнай работай, якая вызначыць перспектывы развіцця таго ці іншага населенага пункта ў сельскай мясцовасці», — сказала Наталля Качанава.

Як адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі, не перашкаджае яшчэ раз звярнуць увагу дэпутацкага корпуса на важнасць работы з людзьмі. Трэба даць магчымасць кожнаму чалавеку быць пачутым і вырашыць пытанні, якія яго хвалююць. Таму была выказана прапанова праводзіць выязныя пашыраныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах штомесячна.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

СІТУАЦЫІ, ЯКІЯ ТРЭБА РЭГУЛЯВАЦЬ ЗАКАНАДАЎЧА

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Справа разглядалася ў Камітэце дзяржмаёмасці. Намеснік старшыні камітэта Мікалай Бобер праінфармаваў, што зямельная спрэчка была разгледжана ў судзе. Калодзеж, згодна з разшэннем суда, знаходзіцца менавіта на зямельным участку Тэрэзы Іосіфаўны. А вось з агароджай узнікла самае сапраўднае непаразуменне. Калі, здаецца, сітуацыя была ўрэгулявана, сусед заявіў, што агароджа на два сантыметры заходзіць на яго ўчастак і гэта перашкаджае росту туй на яго тэрыторыі.

Далей пайшлі судовыя справы. І, што самае парадаксальнае, суд прымае рашэнне перанесці частку агароджы на гэтыя самыя два сантыметры! Хоць у кадастравай сістэме існуюць пэўныя допускі пры вымярэннях.

Справа дайшла да Вярхоўнага суда, які адмяніў дадзенае рашэнне і накіраваў на новы разгляд у абласны суд, дзе нарэшце гэты пратэст быў задаволены. Між тым з Гродзенскага райвыканкама Тэрэзе Іосіфаўне працягваюць паступаць павесткі аб самавольным занятцы часткі зямлі суседа. Гэта доўжыцца тры гады.

Наталля Качанава дала распараджэнне дасканала разабрацца з дадзенай сітуацыяй. І ўвогуле падобныя зямельныя пытанні трэба своечасова ўрэгуляваць, хоць у іх часта ролю адыгрываюць асабістыя адносіны паміж людзьмі. Варта ўлічваць і той факт, што агароджа заяўніцы ставілася адпаведна з заверанымі дакументамі.

Пенсія і сацыяльны пансіянат

Жыхарка аграгарадка Ліпнішкі Іўеўскага раёна Яніна Іванаўна прыйшла на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі па пытанні налічэння пенсіі. Яна — шматдзетная маці, 30 гадоў працавала ў мясцовай гаспадарцы.

Сітуацыю пракаментавала намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марына Арцёменка. Як аказалася, на памер выплат аказаў уплыў і датэрміновы выхад на пенсію, бо жанчына працягвала працаваць. Калі б яна не аформіла пенсію, гэтыя гады таксама ўвайшлі б у стаж і паўплывалі на памер выплат.

Наталля Качанава заўважыла, што людзям трэба часцей гаварыць аб тым, як яны могуць павялічыць памер пенсіі. Яна прывяла ўласны прыклад, калі ёй падказалі, што можна адмовіцца ад пенсіі, каб адпрацаваць вызначаны стаж. Таму варта як мага больш інфармаваць насельніцтва аб такой магчымасці.

Тым не менш канкрэтны зварот будзе разгледжаны дадаткова ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Акрамя гэтага, шматдзетная маці атрымае матэрыяльную дапамогу па лініі Іўеўскага райвыканкама.

Падчас прыёму была ўзнята праблема заканадаўчага рэгулявання прыватных пансіянатаў. З гэтым пытаннем звярнулася мінчанка Надзея Віктараўна, якая ўзначальвае такую ўстанову ў Мінскім раёне. Справа ў тым, што з 1 кастрычніка на прыватныя ўстановы ўводзяцца ліцэнзіі з пэўным спісам патрабаванняў, у тым ліку па лініі МНС і архітэктуры. Надзея лічыць, што выканаць гэтыя патрабаванні за вызначаныя паўгода даволі складана, бо яны больш падыходзяць да адміністрацыйных будынкаў. Магчыма, прыйдзецца зачыніць на некаторы час пансіянат, а вось куды падзець людзей? — задаецца пытаннем Надзея. Разам з тым яна разумее, што кантроль у дадзенай сістэме патрэбны, бо не ўсюды такія ўстановы працуюць добрасумленна.

Менавіта з такім прыкладам сутыкнулася і Старшыня Савета Рэспублікі падчас аднаго з папярэдніх асабістых прыёмаў. Пасля праверкі аднаго з пансіянатаў выявіліся нездавальняючыя ўмовы пражывання насельнікаў. У сувязі з гэтым выйшла пастанова ўрада аб выкананні пэўных патрабаванняў з боку ўстаноў.

— Трэба прывесці гэту сістэму дапамогі ў адпаведнасць усім патрэбным нормам, — выказала меркаванне Старшыня Савета Рэспублікі. — Бо тэма вельмі актуальная, і мы будзем ёю займацца і глядзець, як працуюць нашы органы сацыяльнай абароны. Будзе дадзена даручэнне МУС, Мінпрацы сумесна правесці інвентарызацыю прыватных пансіянатаў і праверыць, наколькі іх дзейнасць адпавядае ўстаноўленым нормам.

Наталля Качанава таксама зазначыла важнасць развіцця медыка-сацыяльнай дапамогі дома. У адпаведнасці з гэтым ёсць неабходнасць злучыць у адным спецыялісце і сацыяльнага работніка, і медыцынскага. Напрыклад, вярнуць у каледжы такую спецыяльнасць, як сястра міласэрнасці.

На шляху да мары

Таццяна Леанідаўна прыйшла на прыём з сынам Мікітам. Хлопчык вучыцца ў сталічнай школе, але марыць паступіць у суворaўскае вучылішча, як яго старэйшы брат. Пасля шостага класа Мікіта таксама падаў дакументы ў ваенную навучальную ўстанову, але параметры яго зроку не адпавядалі нормам.

Па словах маці, старэйшы сын паспяхова займаецца ў суворaўскім вучылішчы, удзельнічае ў парадах, збіраецца звязаць свой лёс з кар'ерай ваеннага. Яго прыклад стаў для малодшага брата свайго роду стымулам у жыцці.

У Мікіты ёсць і альтэрнатыўны варыянт. Як патлумачыў начальнік ваенна-медыцынскага ўпраўлення Міністэрства абароны Аляксандр Малюк, хлопец можа паступіць у ваенную акадэмію альбо на ваенныя факультэты. Гэта яму дазваляецца. Але на дадзеным этапе зрок толькі фарміруецца і невядома, як павядзе сябе ў далейшым, а аператыўная карэкцыя зроку для дзяцей да 18 гадоў забаронена. Наталля Качанава прапанавала перагледзець некаторыя нормы прыёму, як гэта зроблена для прызыўнікоў, і выказала асабістую падзяку Мікіту і яго маці за іх патрыятычную пазіцыю.

— Мікіта, ты не адчайвайся, мы пастараемся табе дапамагчы. Не трэба такіх матывaваных хлопцаў пакідаць без увагі. Гэта пытанне будзем вывучаць, — сказала Наталля Качанава. — Вы выдатная маці, таму што выхаваць такіх дзяцей — гонар. Старэйшы сын вучыцца ў суворaўскім вучылішчы, дачка — старшы лейтэнант у службе МНС. Тое, што вы выхоўваеце сваіх дзяцей у духу любові да Радзімы, дарагога варта.

Пасля прыёму Таццяна Леанідаўна падзялілася з журналістамі сваім уражаннем. У першую чаргу, яна адзначыла эфектыўнасць такіх прыёмаў і чалавечы падыход да вырашэння праблемы.

— Усе дасканала ўнікаюць у сітуацыю, на месцы спрабуюць вырашыць. Наталля Іванаўна па-чалавечы адносіцца да заяўніка, яна не проста выслухоўвае, а імкнецца разабрацца, рыхтуецца да прыёму кожнага суразмоўніка, а нас сёння нямала, — заўважыла маці Мікіты.

Таксама ў поле зроку Старшыні Савета Рэспублікі трапілі пытанні жыллёва-камунальнага кірунку, праблемы перавозкі грузаў, аспекты аховы здароўя, пытанні разліку паміж суб'ектамі гаспадарання. Многія пытанні звязаны з жыццём сельскіх жыхароў. Гэты кірунак будзе пад асаблівай увагай Савета Рэспублікі. «Мы шчыльна зойдземся вёскай, будзе створана рабочая група, будзем комплексна выязджаць і глядзець на месцах», — паабяцала Наталля Качанава.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

не будзе краіны», спецыяліста на сяле?

Яшчэ адна ўмова замацаванасці кадраў на вёсцы — транспартная інфраструктура. «Якасць дарог — адна з самых актуальных праблем для нашай краіны. Аўтамабілізацыя насельніцтва, колькасць транспартных сродкаў прымушае нас больш эфектыўна займацца рамонтам і будаўніцтвам новых дарог, — акцэнтаваў Аляксандр Турчын. — Не менш важна і абнаўленне, мадэрнізацыя аўтобуснага парка. У бягучым годзе мы купляем парадку 140 адзінак аўтобусаў, у наступным — яшчэ 190».

Каб моладзь хацела працаваць на вёсцы, павінна быць і адпаведная сацыяльная інфраструктура. У тым ліку бальніцы, школы, дзіцячыя садкі, установы культуры, спартыўныя аб'екты. «Гэта патрабуе каласальных фінансавых сродкаў. Прывяду адзін прыклад: сёлета толькі ў бягучыя і капітальныя рамонты ўстаноў сацыяльнай сферы мы ўкладваем больш за 300 мільёнаў рублёў», — заўважыў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

Арэнднае жыллё з правам выкупу

З іншага боку, важна вызначыць прырытэтнасць гэтых укладанняў, лічыць Аляксандр Турчын: «У Мінскай вобласці каля 308 аграгарадкоў. Калі гэтая праграма толькі пачыналася, кожны раён імкнуўся ўключыць у яе як мага больш населеных пунктаў. І што мы сёння маем? У нас каля 10 аграгарадкоў з колькасцю насельніцтва менш за 100 чалавек. Ва ўмовах абмежаванасці фінансавых рэсурсаў укладваць велізарныя грошы ў такія населеныя пункты не мае сэнсу. Зразумела, у буйных гарадах, раённых цэнтрах павінны быць адпаведныя ўмовы пражывання. Але трэба разабрацца з аграгарадкамі. Можа, варта правесці іх інтэрвізацыю і вызначыць пералік перспектыўных населеных пунктаў, у якіх ёсць цэнтральная гаспадарка і дзе мы бачым нізкае дэмаграфічнае змяншэнне. Зрабіць іх прырытэтнымі, давесці інфраструктуру пражывання да годнага ўзроўню».

Старшыня Мінскага аблвыканкама таксама прывёў у прыклад Валожын, які актыўна рыхтуецца да абласных «Дажынак»: «У райцэнтр і Івянец укладзена каля 100 мільёнаў рублёў. Прычым гэта не залатыя вуліцы, а вырашэнне тых праблем, якія былі назапашаны дзесяцігоддзямі. Размова аб гарачым водазабеспячэнні ў дамах, каналізацыі, асфальтаванні вуліц. Толькі ў асфальтаванне ўклалі больш за 20 мільёнаў рублёў».

Найважнейшае пытанне ўтрымання кадраў — жыллё. «Відавочнае рашэнне трансфармацыі нашай жыллёвай палітыкі ў бок арэнднага жылля. Але арэнднага жылля не проста як такога, а з наступным правам выкупу», — адзначыў Аляксандр Турчын.

Задача шэрагу рэгіёнаў Мінскай і іншых абласцей — не проста прыцягнуць моладзь, а менавіта замацаваць яе. «У такіх рэгіёнах трэба вызначыць, што сёння для маладых сем'яў мы даём арэнднае жыллё з такой умовай: ты жывеш у гэтым населеным пункце пэўную колькасць гадоў, працуеш. І па сканчэнні гэтага часу маеш права дадзенае арэнднае жыллё набыць ва ўласнасць. На якіх умовах? На мой погляд, тут таксама павінна быць дыферэнцыяцыя, — адзначыў губернатар. — Гэта наймагутнейшы стымул для таго, каб людзі выбіралі якое-небудзь месца працы або якое-небудзь месца жыхарства».

Падводзячы вынік, Аляксандр Турчын адзначыў, што вырашэнне гэтых пытанняў дасць сур'ёзны штуршок для магчымасці замацавання спецыялістаў на вёсцы, у тым ліку маладых.

«Меркаванне Савета Рэспублікі цалкам супадае з вашым, — звярнулася Наталля Качанава да губернатара. — Падтрымліваю вас і па будаўніцтве жылля. Тое ж арэнднае жыллё трэба будаваць пад пэўныя катэгорыі. Будзем рухаць вашы ідэі!»

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Мінскі раён.

«Галасы вёсак, якія сышлі»...

Жыхары адселеных «чарнобыльскіх» паселішчаў у Краснапольскім раёне вяртаюць ім імёны

Вёска Мануйлы знікла з карты раёна ў пачатку 1990-х. Аварыя на ЧАЭС паставіла крыж на яе існаванні. Жыхары былі адселены, дамы — пахаваны. Зрэдку былыя землякі сустракаліся на Радаўніцу на могілках, пасля чаго на дрэвах, якія раслі калісьці каля іх дамоў, з'яўляліся ручнікі або стужачкі. Прайшло амаль сорак гадоў, а памяць жыве. Невядомая сіла цягне ўжо нашчадкаў тых жыхароў на запаведнае месца. І адкрыццё памятнага знака, якое адбылося нядаўна, — пацвярджэнне таму, што час бяссільны перад людской памяццю. Разам з ураджэнцамі вёскі прыехалі іх дзеці і ўнукі. Было шмат слёз, цеплыні і шчырасці. А яшчэ — натхненне, ад таго, што для зніклай вёсачкі атрымалася добрую справу зрабіць. Сабраць грошы і ўвекавечыць яе ў камяні.

Галіна Лацецкая вось ужо 38 гадоў жыве ў Віцебскай вобласці, але родная вёска не адпускае.

— Яна мне дагэтуль сніцца, тыя месцы, дзе я хадзіла, яе жыхары, — прызнаецца яна. — Вёсачка наша была дагледжаная, чыстая, прыгожая. Усяго адна вуліца, на якой 56 двароў. З ранняй вясны да позняй восені ўсё вакол патанала ў кветках, пачынаючы ад бэзу і язміну, заканчваючы хрызантэмамі і вярбінямі. Здаецца, дагэтуль чую іх пах.

Галіна пасля вучобы ў Бабруйскім агратэхнічным каледжы вярнулася на малую радзіму, працавала ў саўгасе «Краснапольскі» бухгалтарам. Там жа выйшла замуж, нарадзіла дваіх дзяцей — Андрэя і Алесю. Жылі, як той казаў, не тужылі, але раптоўна грымнула бяда. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС перакрэсліла ўсё жыццё, узровень радыяцыі ў вёсцы быў такі, што прапанова пераязджаць на новае месца жыхарства хутка з рэкамендацыйнага характару набыла загадны. У 1987 годзе населены пункт пакінула ў асноўным моладзь, апошнія яе жыхары з'ехалі ў 1991-м.

За ідэю ўвекавечыць вёску Галіна Лацецкая ўхапілася не задумваючыся. І адразу ж уключылася ў пошукі землякоў, каб як мага болей людзей далучылася.

— Мне патэлефанавала зямлячка — Галіна Старыковіч, — расказвае жанчына. — У яе на вясковых могілках у Мануйлах пахаваны родныя. Жыве яна ў Хоцімску, але кожны год прыязджае туды на Радаўніцу. Аднойчы яна ўбачыла на могілках аб'яву Яноўскага сельсавета з прапановай неяк абазначыць вёску. І стала ўсім тэлефанаваць. Мы з сястрой Аленай з радасцю падтрымалі праект. Галіна Старыковіч стварыла чат, і туды далучалі ўсіх, чые каардынаты атрымалася знайсці. Камусьці тэлефанавалі: не ўсе ж карыстаецца інтэрнэтам. Ніхто не адмовіўся ад пасільнага ўкладу, кожны ўнёс нейкую суму.

Галіна Лацецкая вельмі ўдзячна старшыні Яноўскага сельсавета Наталлі Лагуцінай за цудоўную ідэю. На адкрыццё памятнага знака прыехала каля 40 чалавек. Адгукнуліся нават тыя, хто там не жыў, а толькі ездзіў да бабуль ды дзядуляў у госці.

— Сустрэча была вельмі чуллівая, я прыехала з сынам Андрэем, — расказвае суразмоўніца. — Шукалі свой дом па дрэвах. Рабіна, якая расла каля яго, на жаль, не захавалася. Мы знайшлі тое месца па нашай яблыньцы. Сын залез на яе і сарваў нам з сястрой па яблыку. Мы пакаштавалі і адчулі смак дзяцінства.

Галіна Старыковіч, якая стала рухавіком ідэі, успамінае, як усё пачалося. Яна тады з братам прыехала на могілкі, каб абрэзаць акацыю: вельмі разраслася. Першы звярнуў увагу на аб'яву брат, Галіна сфатаграфавала яе на тэлефон, а дома ўжо прачыталі. Ініцыятыва спадабалася, і жанчына набрала пазначаны на лістку тэлефон сельсавета. Пагутарыла са старшынёй і натхнілася. Вельмі хацелася нешта карыснае для сваёй малой радзімы зрабіць.

— Калі здарылася чарнобыльская трагедыя, я заканчвала 10 клас, — расказвае яна. — Пасля паехала вучыцца ў Магілёў, а ў Мануйлы прыязджала да таго часу, пакуль там жылі мае бацькі. У 1991-м іх адсялілі ў Дрыбінскі раён у Трылесіна. Яны вельмі балюча гэта перажывалі, казалі, што там чужыя і прасілі пахаваць на радзіме. Спачатку з жыцця пайшла маці, потым — бацька, за ім — сястра. Усе яны цяпер ляжаць на мануйлаўскіх могілках побач з іншымі роднымі. Штогод мы з братам да іх прыязджаем на Радаўніцу, сядзім да абеду, успамінаем. Апошнім часам усё менш людзей наведвае могілкі. Таму я не спадзявалася, што столькі народу адгукнецца.

Патрэбная сума назбіралася вельмі хутка, заставалася прыдумаць эскіз памятнага знака. Галіна Старыковіч разам са старшынёй Яноўскага сельсавета з'ездзілі ў Касцюковічы, дзе і заказалі помнік. Упадабалі адзін вельмі блізкі сэрцу малюнак — сцяжынка, а па абапал яе — бярозавы гай.

— Па дарозе ў школу, якая знаходзілася за тры кіламетры ад нас у суседняй вёсцы, мы беглі міма бярозавага гаю, — успамінае суразмоўніца. — У кожнага жыхара там было сваё дрэва, дзе вясной бралі бярозавы сок. Мы дзецьмі паспявалі раніцай збегаць да бярозы і прынесці смакату дамоў, а потым беглі на ўрокі. Малюнак усхваляваў пачуцці, яго я і прапанавала землякам. Усе выказаліся за. Я крыху дапрацавала яго, дадала спіс з прозвішчамі аднавяскоўцаў, а, каб было зразумела, чаму яны на помніку, дапісала, што яны былі вымушаны пакінуць вёску ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС. Сусед па Мануйлах Сяргей Малюшэўскі прыслаў невялічкі верш пра вёсачку. І мы таксама яго размясцілі. Атрымалася вельмі кранальна. Землякі дзякавалі за тое, што я натхніла іх на гэтую справу. А я ўдзячная ім, што адгукнуліся.

Помнік вырашана было ўстанавіць на месцы, дзе калісьці быў уезд у вёску. Непадалёк знаходзілася маленькая пабудова, якую месцічы называлі «ленінскім пакоем». Там стаяў тэлефон, часта сядзеў калгасны брыгадзір і размяркоўваў паміж людзьмі работу. Вясковыя дзеці таксама любілі там сабрацца, каб потым разам дзесьці пагуляць. Побач лес, невялічкі вадаём, дзе жанчыны мылі бялізну, а потым развешвалі сушыцца наўпрост на высокай траве. А дзяцей вабіла сунічная палянка, дзе можна было ўдосталь наесціся ягад. Вёскі няма, а мясціны, дзе прайшло шчаслівае дзяцінства, можна цяпер распазнаць толькі па дрэвах. Пасля таго, як адкрылі помнік, усе пайшлі шукаць свае дрэвы, каб адчуць на тых месцах энергетыку родных хат.

Дэпутацкая ініцыятыва аказалася вельмі патрэбнай і важнай для жыхароў зніклых вёсак. **Старшыня Яноўскага сельсавета Наталля ЛАГУЦІНА** лічыць, што гэта ідэя не магла не з'явіцца.

— Наша тэрыторыя вельмі пацярпела ад аварыі на ЧАЭС, — расказвае яна. — На забруджаных землях знаходзілася 33 вёскі, якія былі адселены. Людзі сёння там не жывуць, але мы працягваем абслугоўваць тэрыторыю. Там знаходзяцца воінскія пахаванні, грамадзянскія могілкі. Стужачкі на дрэвах, кветкі, пакінутыя на месцах, дзе раней стаялі дамы, заўсёды выклікалі трапяткія пачуцці. Мне было балюча гэта бачыць, хацелася ўвекавечыць людскую памяць. Ды і назвы вёсак захаваць: яны ж такія мілагучныя. Вось толькі дзе было ўзяць грошы? Аднойчы ўбачыла кавалак тканіны на лазовым кусце. Нехта напісаў на ім назву вёскі — Сасновіца. І я зразумела, што павінна зрабіць. Ініцыятыву падтрымалі ў раёне, да добрай справы далучылася магілёўскае тэлебачанне, інфармацыя стала распаўсюджвацца праз сацсеткі. Цяпер ініцыятыва «Галасы вёсак, якія сышлі» набірае абароты. Ідэю падхапіла Краснапольская раённая бібліятэка, якая стварыла на сваёй старонцы ў інтэрнэце адпаведную ўкладку з разліковым рахункам, куды можна перавесці грошы на памятны знак для канкрэтнай вёскі. На гэтай жа старонцы назапашваецца інфармацыя па адселеных вёсках. Людзі маюць магчымасць даслаць туды фота, свае аповеды.

Летась першы памятны знак з'явіўся ў вёсцы Сасновіца. У пачатку сёлетняга верасня ўвекавечылі памяць вёскі Мануйлы. Жыхарам дапамагалі і сельсавет, і дэпутаты. У работу ўключылася кіраўнік спраў Краснапольскага райвыканкама Людміла Герасімава, іншыя работнікі. З магаспадарчых кніг наносіліся на граніт прозвішчы гаспадароў дамоў, якія там стаялі. Прычым у тым жа парадку, у якім размяшчаліся падворкі.

— Паведамленні ад жыхароў вёскі Мануйлы і іх нашчадкаў дагэтуль прыходзяць на мой тэлефон, — удакладняе Наталля Лагуціна. — Людзі хочуць рублём паўдзельнічаць у добрай справе. Я кажу, што памятны знак ужо ўстаноўлены і сродкі больш не патрэбны. Тады яны просяць перавесці іх грошы на выраб памятных знакаў для іншых адселеных вёсак. Сродкі паступаюць на разліковы рахунак, і мы робім памятныя таблічкі з QR-кодамі. Так, па трасе Р-74 мы абазначылі зніклыя пасля чарнобыльскай аварыі населеныя пункты Сцяпанаў Хутар, Шыракаўвелле, Высокі Барок, Шалухоўка, Куракоўка, Горна, Восаў, Сядзібны і Падгоранка. Праект атрымаў вялікі рэзананс і падтрымку. Свой унёсак у яго зрабіла дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандра Міхеенка, старшыня Магілёўскай абласной ветэранскай арганізацыі Анатоль Глаз.

Ініцыятыву сельсавета падхапілі ў раёне. Ужо створана інтэрактыўная пляцоўка, дзе сабрана інфармацыя па ўсіх вёсках раёна, якія існавалі да Чарнобыля. У хуткім часе яна будзе адкрытая. Пляцоўка разлічана ў першую чаргу на моладзь, каб яна не забывалася пра свае карані.

Наталля Лагуціна спадзяецца, што праект дасць людзям магчымасць прадэманстраваць свае найлепшыя якасці. Яе вельмі ўразіла, калі на адкрыцці памятнага знака ў Мануйлах 87-гадовая жанчына прызналася, што гэта быў яе самы шчаслівы дзень, бо яна ўбачыла ўсіх, хто любы яе сэрцу.

— Людзям вельмі важныя тыя вёсачкі, дзе яны нарадзіліся, — кажа дэпутат. — А беларусы ўсе родам з вёскі. Горад так не прываблівае людзей, як вёска. У горадзе можна рэалізавацца, але знайсці радасць і падмацавацца духоўна можна толькі на той зямлі, адкуль твае продкі. Такіх чыстых і па-дзіцячаму шчаслівых твараў, як на адкрыцці памятнага знака ў Мануйлах, я даўно не бачыла. Адчуваецца, што людзей гэта вельмі зачапіла. Галоўнае ў гэтай справе, каб знайшоўся лідар, так званы важак, які ўсіх аб'яднае, сабярэ вакол сябе і давядзе справу да лагічнага завяршэння. У ініцыятывы з Мануйламі ад пачатку да рэалізацыі прайшло ўсяго тры месяцы. За гэты час жыхары сабралі грошы, быў зроблены і ўстаноўлены памятны знак. Людзі з нецярпеннем чакалі гэтага дня. Нельга было без слёз назіраць за тым, як яны шукалі месцы, дзе стаялі іх дамы, як яны сядзелі побач адно з адным на кінутых посцілках і гаманілі. Такі супакой і ціхамірнасць луналі ў паветры, што хацелася толькі адного — радавацца.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Яноўскага сельсавета.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.802. Нумар падпісаны ў 19.30 17 верасня 2024 года.

ПОШУК СВАЁЙ ПАЛАВІНКІ,

альбо Што нас робіць мацнейшымі?

Маляваць можна фарбамі, алоўкам, гуашшу, пяском... А можна — словамі. Такім чынам...

Горад. Праспект. Нехта крочыць у бок вакзала, нехта — насустрач і нават з радасным: «Ну гэта ж трэба!.. Тры гады ў Мінску не была, а тут з маршруткі выйшла — і на табе: знаёмыя ўсё тварыы!

Гэта Света, прыяцелька з недалёкага мястэчка. Грэх не спыніцца, не пагаварыць.

А заадно не ўбачыць, як з крамы паблізу выходзіць жанчына, як шукае вачыма сметніцу — кідае туды чэк ці што?

Паперка зусім невялічкая — не дзіва, што ў цэль не трапляе: прызямляецца побач. Жанчына схіляецца, каб падняць.

На гэты раз з ёй жартуе вецер: падбірае паперку — адносіць трошкі ўбок.

Жанчына спрабуе наступіць, прыціснуць нагой.

І зноў вецер апярэджвае: зрывае паперку з месца і на гэты раз адносіць трохі далей.

Жанчына кідаецца следам.

— Яна што, — здзіўляецца Света, — будзе яе даганяць?!

— Напэўна...

— Бо гэта Мінск?

...І гэта — мінчане: «наезджыя» паперак не даганяюць. Прынамсі, спачатку.

Адна баба казала

Пятніца. Электрычка. Да адпраўлення — дзесяць мінут.

Лаўку насупраць займае адна з «турыстак» (вельмі пажылая жанчына з заплечнікам). Хвілін праз пяць да яе далучаецца другая. Паміж імі — кароткі дыялог (пакуль здымаецца заплечнік): «На дачу?» — «На дачу» — «У вас дзе?»...

А далей дачніцы ўжо як быццам сяброўкі: абмяркоўваюць, што ў каго вырасла і колькі ўсяго закаталі, чаго ў такі добры дзень прыязджалі ў горад, якія лекі ад «даўлення» прымае адна, а якія дакторка прапісала другой, бо...

— У нас, дзякуй богу, — казала першая, — можна ўзяць талончык, трапіць да ўрача. У нас, — ганарылася, — калі нешта нейкае, могуць і ў бальніцу забраць-пакласці. А вось за граніцай (называецца блізкая краіна) — усё па-іншаму. Там пенсіянераў зусім не лечаць — ні за грошы, ні так. Захварэў пажылы чалавек, значыцца, усё: рыхтуйся, а потым лажыся ды паміраЙ... І маладых там моцна ўціскаюць. Нашы — ты ж паглядзі — ходзяць як хочуць! А там з голым жыватом, у кароткай спадніцы аніводнай дзеўкі не ўбачыш! Першы раз на вуліцу выйдзе — штрафам абложаць, у другі — 15 сутак дадуць!

...Засмяцца з гэтых слоў зусім не выпадала, папытацца, адкуль падобныя звесткі — як быццам таксама?

Хутчэй за ўсё, іх сарока на хвасце прынесла? Альбо адна баба казала.

...Дзве пачулі — панеслі далей.

Мода

Абноўка ў гардэробе — светлы пінжачок з доўгімі рукавамі, але ў кожным — унутры — па невялічкім хлясціку, а звонку, на плячы, — па гузічку. Трэба разумець, для таго, каб рукавы можна было падгарнуць і пасля падшпіліць, зрабіць кароткімі. З правым гэта файна атрымалася!

Да левага ў той раз справа не дайшла.

І ў наступны часу не было: пінжачок на плечы і ходу — на трамвайны прыпынак, на работу.

...Ужо тут, у люстэрку ліфта, убачыла, што ў адзежыне адно рукаво доўгае, другое — кароткае.

— Во, — разгубілася, — і ніхто не заўважыў, ніхто не сказаў?

— Было б што заўважаць, — буркнула каляжанка. — У джынсах цяпер адна калошка сіняя, другая белая. Дык чаму б і рукавы так не насіць?

...Дэмакратычная мода: хто ў што прыбраўся, тое панёс. І гэта (дасць бог) не знімуць, і лепшага не дадуць.

Кандыдатак шмат

Павевы часу, як ёсць, так ёсць: суседка развялася са сваім чалавекам на восьмым годзе сумеснага жыцця, іх дачка пратрымалася менш — на чацвёртым, сын — на дзясятым.

...З тым, што сама больш замуж не выйдзе, маці даўно змірылася.

З тым, што наўрад ці пашчасціць дачцэ, здаецца, — таксама.

За сына не хвалявалася: прыгожы мужчына, не бедны, майстравы... «Не сёння дык заўтра ажэніцца, новую жонку прывядзе», — спадзявалася маці.

І ён сапраўды прыводзіў, нават не адну...

Чарговая ў выхадныя да іх на леціша прыязджала, дапамагала бульбу капаць. Суседкі пасля спыталі, ці спадабалася ж кандыдатка ў нявесткі? І як завуць?

— Ой, — схамянулася жанчына, — я ж гэта не запомніла... Іх столькі перавярнулася...

Сваю — а тым больш палавіну і ўжо апёкшыся — вельмі цяжка знайсці. (З парад бывалых: «Шукаць жанчыну без недахопаў можа толькі мужчына без звілін»).

Чалавек спытаў...

Аповед прыяцелькі:

Летам збіралася кухню падначвіць. Не, на мэблю грошай няма... Так, столь пафарбаваць, абоі паклеіць. Паехала ў горад, купіла шэсць трубак, такія цяжкія — ледзь да прыпынка прывалакла!.. Паклала на лаўку, стаю там — чакаю аўтобуса.

Пакуль ён — бачу, нейкі барадач падыходзіць: вочы хітрыя-хітрыя... Спачатку мяне агледзеў — быццам купляць збіраецца, потым — мае шпалеры... «На пакой?» — цікавіцца. — «Не, — кажу, — на кухню». — «Шэсць трубак?.. Яна што ў вас такая прасторная?» — «Чаму б не?» — «І кватэра, мусіць, не меншая?» — «Так, — кажу, раз чалавек пытаецца. — Толькі не кватэра, а хата-пяцісценка, у вёсцы».

Барадач ад гэтых слоў ажно разгубіўся: цікавасць — як карова языком злізала. Пастаяў крыху, памаўчаў ды падаўся прэч. Вясковае жыццё ж на аматара?

Хто б спрачаўся.

Дзе карга, там качарга?

Тэлевізар дома амаль не ўключаецца — хіба ў кухні, калі-нікалі. І ўжо тады адным вокам на пліту ды патэльню, другім — на экран, дзе, здаецца, вайна на вайне і... гульня на гульні.

Чарговае пытанне (ці заданне) у чарговай: утварыць родны склон ад слова «кочерга».

Па мне — гэта лёгка...

А вось з нашым, беларускім, словам цяжкасці былі: у вершы аб тым, што ў вёсцы прападае халасцяк, бо зусім не засталося дзяўчат, сустрэўся радок: «...Хоць жаніся на карзе».

Гэта ж хто такая?

Не хутка здагадалася б, калі б не... качарга.

Проста

Лета, рэчка. Над ёю — высокі бераг, а ўжо на ім — вузкая «стужка»... колікаў — таўсцейшых, танейшых...

— *Что это?* — пытае наш госць з Італіі.

— Бабры, — уздыхаем, — каб ім пуста было!

— *Почему?*

Сёння расказаць аб гэтым прасцей, нават іншземцу: тэлефон дастаў, «загугліў» слова «бабёр» ды паказаў чалавеку, што гэта за звер, якія ў яго зубы, як ён імі «пілуе» дрэўцы і дрэвы, як ладзіць запруды, перакрываючы цэлыя рэчкі... Бяда, карацей... У нас — з бабрамі.

У госця — таксама, бо ён хацеў бы разумець усё, пра што мы гаворым, хацеў бы сам далучацца да размоў, але ж як — прабачце — без ведання моў?!

Чарговы міні-ўрок рускай:

— Значыць, на карцінцы — *бобр*, адзін, — пачынаем тлумачыць госцю. — Калі жаночага полу, самка, то ўжо *бобриха*, калі яны ўдваіх, то *бобры*, калі ў іх дзеці, то *бобрята*...

— *Как это сложно!* — жаліцца італьянец. — *Столько разных слов! Разве можно их все запомнить?!*

А хіба не? Гэта ж так, здавалася б, проста...

(У тэму — замалёўка з натуры.

Дзень. Рэдакцыйны пакой. Дзверы адчыняюцца... *«Здравствуйте! Можно к вам?»* — пытае мужчына і, пачуўшы ў адказ «Калі ласка!», тут жа пераходзіць на родную: нават, больш за тое, пачынае хваліцца, што выдатна ведае абедзве нашы дзяржаўныя і любы, які заўгодна (?) тэкст на рускай можа прачытаць па-беларуску і наадварот.

Крылатае «свежо предание, а верится с трудом!», напэўна, адбіваецца, чытаецца на твары, бо знаўца моў тут жа ўскаквае з прапанаванага крэсла, працягвае руку да кніжак на паліцы...

Хоча даказаць? Але навошта?

— Ну, я ж не сляпы, — зноўку чытае думкі, — я заўважаю, што вы не верыце. Магу даказаць.

— Можаце? Тады, калі ласка, выслоўе Дастаеўскага...

— Ды хоць дзвесце! — гарачыцца госць.

— Адно: *«Каждый из нас предан кому-то или кем-то»*.

Мужчына — слёту — прамаўляе першыя словы, тармозіць, лыпае вачыма — выдае нейкую досыць няўклюдную канструкцыю, чырванее, потым кажа, што падумае і больш дакладны варыянт агучыць па тэлефоне, а пакуль...

Пакуль — хацелася б верыць — не будзе выхваляцца бездакорным веданнем моў.)

За дабро — дабром?

Нехта недурны прызнаў, што ў жыцці ледзь не ўсё часова. І таму, калі справы ідуць добра, трэба цешыцца, назапашваць радасць, бо гэта не назаўсёды.

Калі ўсё дрэнна, таксама перажываць не варта: пройдзе — можа, раней, можа, пазней...

Сяргеевіч пасля смерці жонкі застаўся з дочкамі. Дзякуй богу, што не з малымі: дапамагалі ўжо і гатаваць, і прыбіраць...

Ён ім — таксама, заўсёды і чым толькі мог! Абедзвюх песцію, апранаў-абуваў, абедзвюх прыбіраў, выдаў, замуж аддаваў... А пасля гэтага неяк адважыўся — ажаніўся сам.

І быў бы, напэўна, шчаслівым (жонка прыгожая, добрая, сын яе айчыма прыняў), а вось дочкі мачаху — ні на дух! Галоўнае — каб хоць раз прыехаўшы, каб убачыўшы ды пагаварыўшы...

Ён, вядома ж, перажываў, хваляваўся, чакаў, назвоньваў сам, прыязджаў, прасіў...

Калі ўбачыў, што ўсё гэта марна, змірыўся — болей не назаляў.

А ўрэшце тастамент пакінуў: усю нажытую маёмасць — «рухомую і нерухомую» — пакінуў пасынку.

Трэба разумець, справа прынцыпу: дочкі не даравалі яму, ён — ім. Квіты.

Што супраць прыроды, што за...

Раніца. Горад. Падземны пераход. Напарадзе ледзь клыпае жанчына з палачкай, ледзь валачэ пакет.

— Мо дапамагчы? — пытаем, параўняўшыся.

— Не, — кажа спадарожніца і... аддае ношу.

— ?

Далей мы сунемся разам, і жанчына (ёй гадоў 50, не болей) гэтак жа памалу, праз паўзы-перадыхі расказвае, што зімой перанесла інсульт, што пасля яго ляжала пластом і не верыла, што некалі ўстане, што хацела звесці рахункі з жыццём — назбірала таблетак. Потым, у найбліжэйшую пятніцу («каб усе свабодныя, каб лягчэй пахаваць»), хацела выпіць, але...

У пятніцу не змагла — адлажыла да панядзелка.

Потым — яшчэ раз да пятніцы. І зноў да панядзелка.

А ўжо тады расплакалася, прызналася ва ўсім дакторцы...

І, мусіць, не першай, бо тая, амаль не здзівіўшыся, сказала, што людзям уласціва ўкарочваць сваё жыццё, але пакрысе — знясільваца цяжкай работай, атручваць сябе цыгарэтамі, алкаголем, а вось каб адразу... Гэта ненармальна, гэта супраць чалавечай прыроды. Згодна з ёй — усё ж спадзявацца, вяртацца да жыцця.

— І гэта, як бачыце, можна, калі нацэліцца, узяцца за розум, — запэўнівала жанчына.

...У яе ў той дзень было вялікае свята: яна ўпершыню па прыступках спусцілася ў падземны пераход, скадзіла ў краму, «шмат што купіла» (наўскідку — кілаграмы са два) і вярнулася дамоў — сама.

...Класікі: тое, што забівае, робіць нас мёртвымі. Тое, што НЕ забівае, робіць мацнейшымі.

Ці не так?

Валянціна ДОЎНАР.

Знаходкі

Хто казаў, што газета жыве адзін дзень? Не! І яшчэ раз не!

«Разбіраючы дома старыя паперы, мы знайшлі сярод іх цудоўна захаваны, але ж нейкі «не такі», незвычайны выпуск «Звязды», — паведаміла ў рэдакцыю Аксана Казакова з Гомеля. — Цікава было разгарнуць, пачытаць... Яшчэ цікавей — убачыць, што нумар — ад 18 жніўня... 1939-га года, што яму 85 гадоў! Але гэта яшчэ не ўсё, — чытаем у лісце, — бо сёлета, у 2024-м, і якраз 18 верасня спаўняецца 85 нашаму дарагому бацечку, дзядулю і прадзеду Мікалаю Васілевічу Новіку.

На свае дзіцячыя вочы наш імяніннік бачыў вайну, змалку зведаў, што такое голад, цяжкая фізічная праца і адна пара абутку на ўсю сям'ю...

Пры гэтым ён паспяхова скончыў школу і Харкаўскі аўтадарожны інстытут, больш за 40 гадоў адпрацаваў на транспарце: па прыступках службовай лесвіцы падымаўся ад пасады старшага інжынера ПТА да галоўнага эканаміста, намесніка начальніка вытворчага аб'яднання «Гомельаблаўтатранс», мае сярэбраны медаль ВДНГ за навуковую працу, з'яўляецца ліквідатарам катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

А да ўсяго наш дарагі Мікалай Васілевіч цудоўны сем'янін. Разам з мамай у любові і згодзе яны пражылі 56 гадоў, выгадавалі дваіх дзяцей, траіх унукаў, прычакалі праўнука.

...На вялізны жаль, тата цяпер адзін. З ранняй вясны да глыбокай восені шчыруе на дачным участку, вырошчвае садавіну-гародніну, з радасцю дзеліцца ёй з усімі ахвотнымі.

Ён пабудаваў дом, выхаваў сына з дачкой, пасадзіў сад. Прыклад, згадзіцеся, варты пераймання!

...Мы любім збірацца ўсе разам, — піша дачка, — з задавальненнем слухаем татавы ўспаміны і, вядома ж, зычым яму найлепшага: будзь, калі ласка, здаровым і жыві доўга!

Ад рэдакцыі. *У звяздоўскім музеі ёсць старыя нумары газеты, у асноўным — з пасляваенных часоў.*

Не адмовіліся б ад гэтага, можна сказаць, святочнага, за 18 верасня 1939-га... Можа, сям'я адшукаде?

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор электронных торгов	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 (www.cpo.by)
Продавец	ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9. УНП 100219778
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов: имущество, бывшее в употреблении (2002 г. в.)

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС, бел. руб.
1	**Блок-модуль № 8 БК-1** (инв. № 100000041721)	2 400,00
2	**Блок-модуль № 8 БК-12** (инв. № 100000041724)	2 400,00
3	**Блок-модуль БК-21** (инв. № 100000041738)	3 120,00
4	**Блок-модуль БК-22** (инв. № 100000041739)	3 120,00
5	**Блок-модуль БК-23** (инв. № 100000041741)	3 120,00
6	**Блок-модуль БК-24** (инв. № 100000041742)	3 120,00
7	**Вагон передвижной** (инв. № 100000041752)	3 120,00

Месторасположение: лоты №№ 1–6 – Могилевская обл., Осиповичский р-н, Лапичский с/с, д. Лапичи, лот № 7 – Минская обл., г. Молодечно, ул. Либава-Роменская, д. 165

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены	
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО Банк БелВЭБ (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов
Условия оплаты предмета электронных торгов	**10 (десять)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи
Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов	
Дата и время начала и окончания электронных торгов	Начало торгов в 11.00 **18.10.2024**. Окончание торгов в 12.00 **18.10.2024**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **17.10.2024** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) **извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего**

ОАО «Компания «МогНат» (Могилев, ул. Карла Маркса, 17)

Аукцион состоится 22.10.2024 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – котельная, пл. – 687,6 кв. м;
капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – мазутонасосная, пл. – 41,0 кв. м;
капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – склад, пл. – 44,2 кв. м;
капитальное строение с инв. 700/С-68775 – тарный склад, пл. 459,9 кв. м;
капитальное строение с инв. 700/С-104263 – артскважина в сборе, в количестве 2 шт.;
капитальное строение с инв. 700/С-104715 – забор-ограждение № 2, протяженность – 154,7 кв. м;
ограждение артскважины, инв. № по бух. уч 4075.
Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64, 64В, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 (пл. – 0,4562 га, доля в праве 2131/2281). Отдельный земельный участок под обслуживание лота № 1 не выделен.
Начальная цена продажи: 350 000,00 бел. руб. с учетом НДС.
Сумма задатка: 35 000,00 бел. руб.

Лот № 2: капитальное строение с инв. 700/С-55075 – транспортный цех, пл. – 905,7 кв. м;
капитальное строение с инв. 700/С-91632 – весовая, пл. – 104,6 кв. м;
капитальное строение с инв. 700/С-99164 – внутренние дороги, пл. – 3448,0 кв. м;
капитальное строение с инв. 700/С-104711 – забор-ограждение № 1, протяженность – 102,7 кв. м;
откатные ворота, инв. № по бух. уч. 5274;
забор из профнастила, инв. № по бух. уч. 5284;
забор из профнастила с воротами, инв. № по бух. уч. 5299.
Начальная цена продажи: 1 250 000,00 бел. руб. с учетом НДС.
Сумма задатка: 125 000,00 бел. руб.

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X.
Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901.
Срок внесения задатков и подачи документов для участия в аукционе: по 21.10.2024 до 11.00.
Победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии с выдаваемым счетом-фактурой. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.
Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее, чем за три календарных дня до даты аукциона.
Доп. информацию можно получить по тел. +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by.

ОАО «АСБ Беларусбанк», организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк»,
ИНФОРМИРУЕТ ОБ ОТМЕНЕ АУКЦИОНА,
назначенного на 26.09.2024 (извещение опубликовано в газете «Звязда» 21.08.2024 №162 (30296)).
Контактные телефоны: 8 (0212) 24-48-55, 8 (029) 309-42-19.
УНП 100292912

Сервисно-торговое республиканское унитарное предприятие «Торговый дом «Восточный»
ИНФОРМИРУЕТ ОБ ОТМЕНЕ АУКЦИОНА,
назначенного на 24.09.2024 в 15.00 (извещение и дополнение к извещению, опубликованные в газете «Звязда» от 24.08.2024 № 165 (30299) и 12.09.2024 № 178 (30312)).
Контакты организатора аукциона: +375 44 763 62 63, +375 17 275 75 12.
УНП 101127833

Организатор торгов (**ликвидатор Совместного общества с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс»**) объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества в форме аукциона

Продавец	Совместное общество с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс»
Место проведения торгов	г. Минск, ул. Лещинского, дом 12, комн. 9
Дата и время проведения торгов	02.10.2024 г. в 12.00
Срок подачи заявок	Не позднее 27.09.2024 г. до 17.00
Ранее опубликованные извещения о проведении торгов	Газета «Звязда» от 02.12.2023 № 234 (30114), от 14.02.2024 № 31 (30165), от 13.04.2024 № 74 (30208)

Предмет торгов и начальная цена

№ лота	Наименование лота	Начальная цена лота, руб. без НДС
1	Капитальное строение с инв. № 500/С-43932, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12, общей площадью 1204,5 кв. м, наименование: главный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды	3 200 000
2	Капитальное строение с инв. № 500/С-43933, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/1, общей площадью 721,9 кв. м, наименование: помещение мойки, кафе, административные помещения, назначение: здание многофункциональное, расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды	1 750 000
3	Капитальное строение с инв. № 500/С-43836, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/2, общей площадью 538,4 кв. м, наименование: вспомогательный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды	1 200 000

Обременения	В отношении всех лотов – ипотека, аренда
Порядок подачи заявок	Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются по месту проведения торгов либо направляются по адресу: 220052, г. Минск, а\я 17 (получатель – ликвидатор СООО «Петрофф Плюс» ИП Ржеутский А.В.), со дня выхода настоящего извещения
Задаток	Задаток в размере десяти процентов от начальной цены лота перечисляется на р/с BY90 PJCB 3012 0763 3310 0000 0933 в «Приорбанк» ОАО, г. Минск, БИК PJCBBY2X, получатель – СООО «Петрофф Плюс»», УНП 190861019
Условия аукциона	Шаг аукциона: пять процентов. При признании торгов несостоявшимися, в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, и он согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, а также победитель аукциона (претендент на покупку) должен заключить с продавцом договор купли-продажи в течении двух рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц. Оплата стоимости предмета торгов осуществляется в течение пяти банковских дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не определено договором купли-продажи. Возмещение затрат, связанных с организацией и проведением торгов осуществляется участником, выигравшим торги, в течение пяти банковских дней со дня проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты их проведения. Порядок проведения аукциона установлен Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

С дополнительной информацией можно ознакомится по тел. +375 29 667 16 72.

Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

№ лота	Наименование объекта/ Адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по подготовке зем.- кадастр. док. (руб.)	Ограничения и условия в его использовании	Инженерное обеспечение земельного участка
1	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом (площадь застройки – 143 кв. м, готовность – 39 %) в г. Бресте, **переулок Ясногорский 2-й, 2** и земельный участок	140100000 001024231	0,1081	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	**67 477,85** (38 950,26 – не завешенный строительством незаконсервированный жилой дом, 28 527,59 – земельный участок)	13 000,00	**3 686,57**	0,1081 га – природные территории, подлежащие специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения); 0,0033 га – охранная зона электрических сетей; 0,0048 га – охранная зона объектов газораспределительной системы	Существует возможность подключения к системам газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения

Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с Положением о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Брестского городского исполнительного комитета от 06.12.2021 г. № 1619

Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 — **4 000,00 рублей**

Организатор аукционных торгов –	**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 16.00 16.10.2024 г.**
КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон 53 81 92	

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть платы за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

• в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать, в установленном порядке, проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;

• представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

Аукцион состоится 22 октября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал.
Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 18.09.2024 г. до 16.00 16.10.2024 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: сб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.
Контактный телефон 53 81 92. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Высокія тэхналогіі

У БЕЛАРУСІ ПРАВЕДЗЕНЫ АПЕРАЦЫІ НА «ЗАБЫТЫМ КЛАПАНЕ» СЭРЦА

У Беларусі супрацоўнікамі РНПЦ «Кардыялогія» ўпершыню праведзены аперацыі на трохстворкавым клапане сэрца

У міжнароднай медыцынскай літаратуры трохстворкавы клапан сэрца нярэдка называюць «забыты клапан»: на працягу доўгага часу яго ізаляванай паталогіі не ўдзялялася дастатковай увагі. Пры гэтым наяўнасць значнай недастатковасці трохстворкавага клапана цесна карэлюе з верагоднасцю смяротных зыходаў. З развіццём тэхналогій эндаваскулярнага лячэння структурнай паталогіі сэрца стаўленне да ізаляванай паталогіі дадзенага клапана прынцыпова змянілася.

Супрацоўнікі РНПЦ «Кардыялогія» на працягу доўгага часу праводзілі падрыхтоўчую работу для таго, каб самыя сучасныя метады карэкцыі трыкуспідальнай недастатковасці сталі даступны грамадзянам Рэспублікі Беларусь. Гэтыя намаганні ўвянчаліся поспехам: 11 верасня 2024 года ва ўмовах рэнтгенаперацыйнага аддзела інтэрвенцыйнай кардыялогіі РНПЦ «Кардыялогія» былі выкананы дзве першыя аперацыі па імплантацыі сістэмы TriClip (ЗША). Яны праведзены мультыдысцыплінарнай урачэбнай брыгадай у складзе кандыдата медыцынскіх навук Алега Паланецкага, доктара медыцынскіх навук Валерыя Стальмашка, доктара медыцынскіх навук Алены Курлянскай, Таццяны Асмалоўскай, Аляксандра Шынгарэева і Андрэя Бурага. Пасля праведзенай аперацыі пацыенты знаходзяцца ў здавальняльным стане і хутка аднаўляюцца.

Выкананне тэхналогіі транскатэтарнай пластыкі трохстворкавага клапана (TriClip) у РНПЦ «Кардыялогія» чарговы раз пацвярджае найвышэйшы ўзровень беларускай кардыялогіі. Цэнтр стаў другім сярод краін СНД, дзе ўкаранёна гэта методыка. Прыярытэтнай задачай РНПЦ «Кардыялогія» з'яўляецца далейшае асваенне гэтай тэхналогіі і ўкараненне яе ў вядучых рэгіянальных кардыялагічных цэнтрах краіны.

Акрамя таго, мінулы тыдзень адзначаны актыўным прасоўваннем высокатэхналагічнай дапамогі пацыентам з сардэчна-сасудзістай паталогіяй у рэгіёны. Пры падтрымцы спецыялістаў РНПЦ «Кардыялогія» ў Магілёўскім абласным клінічным кардыялагічным цэнтры і ў Віцебскай абласной клінічнай бальніцы праведзены аперацыі па транскатэтарнай імплантацыі аартальнага клапана. Дадзеныя аперацыі прызначаны для пацыентаў з высокай рызыкай хірургічнага ўмяшання.

У Магілёве прааперыраваны два пацыенты. Паколькі ў магілёўскіх рэнтгена-эндаваскулярных хірургаў пад кіраўніцтвам загадчыка рэнтгенаперацыйнай Андрэя Гарэлікава ўжо меўся досвед правядзення такіх аперацый, дадзеныя ўмяшанні былі выкананы пад мясцовай анестэзіяй, што больш спрыяльна для пажылых пацыентаў.

У Віцебскай абласной клінічнай бальніцы аперацыі па транскатэтарнай імплантацыі аартальнага клапана праводзіліся ўпершыню. Брыгадай пад кіраўніцтвам загадчыка кабінета ангіяграфіі Андрэя Куцько на працягу аднаго дня былі прааперыраваны тры пацыенты.

Усе аперацыі прайшлі паспяхова. Характэрнай асаблівасцю аперацый па транскатэтарнай замене аартальнага клапана з'яўляецца хуткае аднаўленне пацыентаў і магчымасць ранняй выпіскі, што зніжае нагрузку на сістэму аховы здароўя.

З боку РНПЦ «Кардыялогія» дапамогу ў падрыхтоўцы і правядзенні аперацый аказаў загадчык рэнтгенаперацыйнага аддзела інтэрвенцыйнай кардыялогіі, кандыдат медыцынскіх навук Алег Паланецкі.

Смачна есці!

ЯБЛЫКІ ДАПАМАГАЮЦЬ...

У чым карысць восеньскіх пладоў?

Багацце вітамінаў і мінералаў у яблыках станоўча паўплывае на работу ўсіх сістэм арганізма, расказала інструктар-валеолаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юлія КЛІМЧАНКА.

Дапамагаюць пазбавіцца ад лішняй вагі

Вялікае ўтрыманне клятчаткі, якая выклікае пачуццё сытасці, і нізкае ўтрыманне калорый пацвярджаюць разумны выбар тых, хто жадае пахудзець ці кантралюе вагу.

Нармалізуюць работу кішэчніка

Яблыкі багатыя харчовымі валокнамі, якія стымулююць работу стрававальнага тракта і станоўча ўздзейнічаюць на яго мікрафлору.

Спрыяюць профілактыцы сардэчна-сасудзістых захворванняў

Пекцін, які змяшчаецца ў яблыках, дапамагае знізіць узровень халестэрыну, запавольваючы развіццё атэрасклерозу і памяншаючы рызыку ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Перашкаджаюць старэнню

Поліфенолы і вітамін С валодаюць магутнымі антыаксідантнымі ўласцівасцямі, абараняючы клеткі ад пашкоджанняў, а арганізм — ад старэння. Таксама вітамін С спрыяе сінтэзу калагену, які ў сваю чаргу робіць скуру гладкай і пругкай.

Умацоўваюць імунітэт

Аскарбінавая кіслата павялічвае ўстойлівасць арганізма да розных інфекцый.

Зніжаюць рызыку развіцця цукровага дыябету

Поліфенолы, якія маюцца ў яблыках, абараняюць клеткі падстраўнікавай залозы ад пашкоджанняў, павялічваюць адчувальнасць клетак арганізма да інсуліну, дапамагаючы падтрымліваць узровень цукру ў крыві ў межах нормы.

Падтрымліваюць работу мозга

Кверцецін (вітамін групы Р) аказвае спрыяльнае ўздзеянне на цэнтральную нервовую сістэму, у тым ліку зніжае рызыку ўзнікнення ўзроставай дэменцыі.

Вялікая частка карысных рэчываў сканцэнтравана ў лупіне яблыкаў і ў мякаці пад ёй, таму гэту садавіну карысна ёсці цалкам.

Людзям з павышаным узроўнем цукру ў крыві варта ведаць, што плады чырвоных і жоўтых сартоў утрымліваюць значна больш цукру і маюць больш высокі глікемічны індэкс у параўнанні з пладамі зялёнага колеру.

Людзям, якія пакутуюць на захворванні страўніка-кішэчнага тракта, таксама неабходна памятаць, што сырыя плады, асабліва кіслыя, здольныя раздражняць слізістую абалонку страўніка. Менш шкоды нанясуць запечаныя ці тушаныя яблыкі.

Пры індывідуальнай неперанасносці дадзенага прадукту таксама варта праяўляць асцярожнасць.

Скажыце, доктар...

СТАЛАЯ АСОБА

Чаму мяняецца характар чалавека на пенсіі і якія перамены — норма?

Згодна з класіфікацыяй Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, пажылы ўзрост пачынаецца пасля 60 гадоў. А з ім прыходзяць не толькі заўважныя змены ў знешнім выглядзе, стане здароўя, але і ў кагнітыўных здольнасцях. Памяць, увага, мысленне не такія, як у маладосці, і часам гэта абсалютна нармальна. Як жа тут вызначыць, дзе непаталагічныя змены, якія не патрабуюць медыкаментознага лячэння, а дзе ўжо паталогія?

Непаталагічныя змены псіхікі і паводзін у людзей пажылога ўзросту звязаны з натуральным працэсам старэння і шэрагам псіхасацыяльных стрэсаў і канфліктаў, якія праходзіць у гэтым узросце чалавек.

